ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 36-ы
№ 90 (2244)
11 лістапада 1967 г. СУБОТА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Марк СМАГАРОВІЧ

КРОЧЫМ МЫ...

Гледзячы ўдачеч вачыма
прарочымі,
Сцёршы мінуўшчыны
цень,
К мэце жаданай упэўнена
крочым мы,
Крочым у заўтрашні
дзень.

Крочым — заводы
ўзнімаюцца, фабрыкі,
Крочым — растуць
гарады.
Крочым — і рэха ляціць
аж да Афрыкі,
Множыць Свабода рады.

Сілы ў хадзе гэтай намі
падвоены.
Мір нам патрэбен, спакой.
Крочым — каб быў
назаўсёды ўсталёваны,
Свет без пакут і без войн.

ПЕРАМОЖНЫ МАРШ КАСТРЫЧНІКА

Калі б можна было ў гэтыя гадзіны акінуць адным позіркам усю нашу краіну, «ад Масквы да самых да ўскраін», — які б захапляючы, які пудоўны малюнак паўстаў перад вачыма: тысячы гарадоў і вёсак у кумачы сцягоў і транспарантаў, дзесяткі мільёнаў радасных, усхваляваных твараў.

Савецкі народ святкаваў дзень свайго нараджэння, дзень нараджэння першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

І, як заўсёды, у цэнтры вялікага свята — Масква, галоўны горад краіны. Тут, па Краснай плошчы, ля сівых сцен Крамля, ля гранітных пліт Маўзалея Уладзіміра Ільіча Леніна з асаблівай яснасцю адчуваецца бег часу, часу, які вось ужо пяцьдзесят гадоў увесь свет адлічвае па Крамлёўскіх курантах.

...Стрэлкі гадзінніка на Спаскай вежы набліжаюцца да дзесяці. Трыбуны для ганаровых гасцей займаюць пасланцы маскоўскіх прадпрыемстваў і падмаскоўных гаспадарак, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі, дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва, ваеначальнікі Узброеных Сіл СССР.

Ніколі яшчэ Красная плошча не бачыла гэтак многа зарубежных гасцей — тысячы сяброў з розных краін свету прыехалі ў Маскву, каб падзяліць з намі свята.

На Цэнтральную трыбуну падымаюцца таварышы **Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, А. М. Касыгін, А. П. Кірыленка, К. Т. Мазураў, М. В. Падгорны, Д. С. Палянскі, А. Я. Пельшэ, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, Ю. У. Андропаў, В. В. Грышын, П. Н. Дзёмічаў, Д. Ф. Усцінаў, І. В. Капітонаў, Ф. Д. Кулакоў, Б. М. Панамароў, М. С. Саломенцаў.** Тут таксама **К. Я. Варашылаў, А. І. Мікаян, М. М. Швернік.** Разам з імі — кіраўнікі і члены дэлегацый сацыялістычных краін, братніх камуністычных і рабочых партый.

...Б'юць куранты, і з іх апошнім — дзесятым ударам, роўна ў 10.00 са Спаскіх варот Крамля выязджае адкрытая машына. У ёй міністр абароны СССР Маршал Савецкага Саюза А. А. Грэчка, які прымае парад. Ён аб'язджае войскі, вітаецца з воінамі, віншуе іх з 50-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Затым А. А. Грэчка падымаецца на трыбуну Маўзалея і гаворыць прамову, у якой спыняецца на велічным шляху, што прайшла краіна за пяцьдзесят гадоў сваёй гісторыі, гаворыць пра вялізныя поспехі савецкага народа. Міністр абароны характарызуе міжнародную абстаноўку, гаворыць аб падкопах імперыялістаў у розных канцах свету, аб неабходнасці мацаваць абараназдольнасць нашай краіны. А. А. Грэчка запэўнівае партыю і ўрад, савецкі народ, што Узброеныя Сілы Савецкага Саюза заўсёды гатовы выканаць свой абавязак перад Радзімай.

Пасля прамовы міністра абароны пачынаецца ваенны парад. Сёлета ён быў незвычайны. Перад прысутнымі на плошчы, перад мільёнамі тэлегледачоў нібы прайшла сама гісторыя...

Ідуць людзі з вінтоўкамі ўзору 1891 года. Апрануты яны па-рознаму: хто ў скуранай куртцы, хто ў паліто. Гэта — чырвонагвардзейцы.

У бесказырках, у бушлатах, в кулямётнымі стужкамі крыжнакрыж плошчу перасякаюць рэвалюцыйныя матросы, уваскрашаючы гераічныя кастрычніцкія дні.

Аркестр мяняе рытм, сустракаючы легендарную конніцу, якая ў свой час упісала яркія старонкі ў гісторыю Чырвонай Арміі. А вось рухаецца артылерыйскі дывізіён на коннай цязе, за ім дывізіён бронеаўтамабіляў — дакладная копія тых, што можна было сустрэць па вуліцах рэвалюцыйнага Петраграда...

...Паветра ўзрывае барабанны пошчак. Гэта юныя барабаншчыкі адкрываюць марш часцей Савецкай Арміі.

Як заўсёды, яго пачынаюць слухачы ваенных акадэмій — нашай кузні ваенных кадраў, якая выпусціла сотні выдатных ваеначальнікаў, праславіўшых Радзіму на палях бітваў.

Прайшлі акадэміі, і наваколле запаўняе грукат магутных матораў. На плошчу ўступае ваенная тэхніка. Строга трымаюць раўненне бронетранспарцёры, іх змяняюць самаходныя зенітныя ўстаноўкі. Услед за танкамі ідзе артылерыя. Марш артылерыстаў завяршаюць рэактыўныя ўстаноўкі.

Плывуць і плывуць па плошчы, вызываючы на трыбунах воклічы захаплення, ракеты. Розных тыпаў, розных радыусаў дзеяння — ад невялікіх зенітных, да міжкантынентальных стратэгічных, якія здольны даставіць у любы канец зямнога шара на аб'ект агрэсара ядзерны зарад вялізнай магутнасці. Такіх магутных ракет няма ні ў адной арміі свету...

І вось закончаны парад, які яшчэ раз паказаў, што Савецкія Узброеныя Сілы — гэта несакрушальны аплот міру і бяспекі нашай сацыялістычнай Радзімы.

Мінутнае зацішша, і Красную плошчу заліває колер рэвалюцыі, колер Кастрычніка. Удзельнікі галоўнай калоны, апранутыя ў чырвоныя касцюмы, нясуць сотні пунсовых палотнішчаў. Гэтая калона і пачынае дэманстрацыю працоўных сталіцы.

Многа гадзін працягваецца святочнае шэсце масквічоў. Калона за калонай праходзяць людзі розных прафесій — вучоныя, інжынеры, урачы, работнікі мастацтва, будаўнікі, рабочыя заводаў...

Красная плошча яшчэ не бачыла такога яркага ўсенароднага свята. І калі апошні вал кумачовага прыбою пракаціўся ля гранітных трыбун Маўзалея, на плошчу выйшлі тысячы камсамольцаў. Над іх радамі вырастаюць вялізныя літары — ва ўсю шырыню плошчы ўзнікаюць словы:

«Народ і партыя адзіны!»

Магутнае «ура» перакатваецца па плошчы, і як заключны акорд свята ў неба ўзмываюць гронкі шароў. Яны ўносяць у вышыню вымпелы з надпісам «50 гадоў Кастрычніка».

Урачыста гучыць мелодыя «Інтэрнацыянала». Пад гукі партыйнага гімна краіна пачынае марш у другую палову першага веку сацыялізма.

...У гэтым маршы адно з пачэсных месц належыць Савецкай Беларусі. Яе народу ёсць чым ганарыцца, ёсць што паказаць — сапраўды велічны шлях прайшоў ён за апошнія паўвеку, шлях ад самага адсталага краю царскай імперыі да рэспублікі, якая на ўвесь свет славіцца сваёй прамысловасцю, сваёй культурай, навукай, мастацтвам.

Вось таму ў такім цудоўным настроі выйшлі працоўныя Беларусі на святочныя дэманстрацыі. У гэтыя хвалюючыя святочныя гадзіны ў кіпенні кумача былі і горад беларускіх шахцёраў Салігорск, і пасёлак нафтаразведчыкаў на Палессі, і далёкая рыбацкая вёска на Браслаўшчыне, і малады горад Жодзіна, дзе нараджаюцца буйнейшыя ў свеце самазвалы...

Мінск. Сталіца двойчы ардэнаноснай Беларусі. У гэтую цяжкую лістападаўскую раніцу наш родны горад, адроджаны з папялішчаў, быў па-асаблівому прыгожы.

У святочным кумачовым убранні шырокія вуліцы і плошчы. Іх запоўнілі тысячы і тысячы людзей.

Застылі на Цэнтральнай плошчы войскі Мінскага гарнізона. Набліжаецца мінута адкрыцця парада. На цэнтральную трыбуну паднімаюцца таварышы П. М. Машэраў, Ц. Я. Кісялёў, І. М. Макараў, С. А. Пілатовіч, І. Я. Палякоў, С. О. Прытыцкі, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў, Г. М. Жабіцкі, А. І. Золаў, У. Г. Каменскі, С. М. Кішкін, І. Ф. Клімаў, П. Л. Коханаў.

Камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі генерал-палкоўнік І. М. Трацяк пачынае аб'езд войск. Ён вітаецца з воінамі, віншуе іх са слаўным юбілеем Савецкай дзяржавы.

Закончыўшы аб'езд войск, генерал-палкоўнік І. М. Трацяк падымаецца на трыбуну і гаворыць прамову. У ёй камандуючы падкрэслівае, што Узброеныя Сілы, народжаныя Вялікім Кастрычнікам, выхаваныя Камуністычнай партыяй, маюць усё неабходнае, каб з гонарам адстаяць заваёвы Савецкай улады.

Гучыць магутнае «Ура!», якое зліваецца з залпамі артылерыйскага салюта. Пачынаецца парад войск Мінскага гарнізона. Яго па традыцыі адкрываюць юныя барабаншчыкі-суворавуцы. Затым па плошчы, чаканячы крок, у строгім раўненні праходзяць калоны афіцэраў штаба Беларускай ваеннай акругі, слухачоў Мінскага вышэйшага інжынернага радыётэхнічнага вучылішча, мотастралкоў-гвардзейцаў, артылерыстаў, танкістаў, сувязістаў, лётчыкаў, маракоў, суворавуцаў.

Ідзе магутная баявая тэхніка — бронетранспарцёры, артылерыя розных калібраў, ракеты, танкі на трайлерах.

Баявы марш, які яшчэ раз прадэманстраваў магутнасць нашай арміі, заканчваецца. На Цэнтральную плошчу рушыў людскі паток. Пад велізарным сцягам з сілуэтам Уладзіміра Ільіча Леніна ідуць ветэраны партыі — тыя, хто пяць дзесяцігоддзяў назад ішоў на штурм капіталізму. Ветэраны адкрываюць тэатралізаваны марш-парад «Гэтых дзён не змоўкне слава».

На Цэнтральнай плошчы з'яўляецца гіганцкае пано, на якім намаляваны легендарны крэйсер «Аўрора». На другім пано — галоўныя вароты Зімняга. І раптам настаўшую на некаторы час цішыню разрывае гарматны раскат, які данёсся з дынамікаў. Ён зліваецца з магутным «Ура!», на плошчу накіроўваюцца патокі штурмуючых: салдаты, матросы, рабочыя, сяляне. Над натоўпам чырвонае палотнішча, на якім словы «Уся ўлада Саветам!».

З затоеным дыханнем наглядалі мінчане за сцэнамі, якія ўваскрашаюць слаўную старонку гісторыі Савецкай дзяржавы, падзеі, што ўзрушылі ўвесь свет і з'явіліся пачаткам эры сацыялізма. Пад грамавое «Ура!» і гукі «Інтэрнацыянала» праходзіць бранявік. На ім — Ленін выступае з прамовай. Яго вітаюць узброеныя рабочыя, матросы і салдаты.

Ідуць салдаты Мінскага палка, скача будзёнаўская конніца, праносяцца танкі. Этап за этапам праходзіць перад вачыма слаўны шлях нашай Радзімы. А вось па плошчы ідуць з бадзёрымі песнямі юнакі і дзяўчаты. А хутка ўся плошча закружылася ў віхры танца. Раптам абрываецца музыка. Чуюц-ца свіст і выбухі бомб. Вайна...

У каго не сціснулася зноў сэрца пры гэтым малюнку, каму не ўспомніліся гады ваеннага ліхалецця. Але народ наш не пахіснуўся. Вось наступная жывая кампазіцыя — яна расказвае аб доблесці і мужнасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

Беларускі народ грудзьмі стаў на абарону заваёў Кастрычніка. Яго лепшыя сыны і дочкі ўліліся ў рады доблеснай Савецкай Арміі. У тыле мужна змагаліся з ворагам партызанскія атрады, падпольныя групы. Кампазіцыі, што рухаюцца па плошчы, адлюстроўваюць героіку незабыўных дзён барацьбы з фашызмам.

Наступныя старонкі — перамога над гітлераўскай Германіяй, самаадданая праца савецкіх людзей па аднаўленню разбуранай народнай гаспадаркі. Перад гледачамі праплываюць страшныя малюнкі разбуранага Мінска. Але яшчэ тады, у 1944 годзе, на ўцалеўшых будынках горада можна было ўбачыць надпісы «Адновім цябе, наш родны Мінск!»

І мінчане пры дапамозе ўсёй рэспублікі, усёй краіны стрымалі сваё слова. Вось ён, сённяшні цудоўны наш горад, буйнейшы індустрыяльны і культурны цэнтр. Вось яна, уся рэспубліка, у росквіце сіл!

Ідуць, ідуць калоны. Ідзе магутная тэхніка, зробленая залатымі рукамі беларускіх рабочых: трактары, аўтамабілі, камбайны...

Яркімі кветкамі зззяюць раённыя эмблемы. Кожны ж раён мае свой твар. Ідуць аўтамабілі-і трактарабудаўнікі, ідуць вучоныя, студэнты, артысты, чыгуначнікі...

Палымнеюць чырвоныя сцягі, звіняць песні, чуецца радасны смех — па вуліцах ідзе народ, народ, які стварыў цуды, народ, на які раўняецца ўвесь свет.

А вечарам плошчы і вуліцы сталіцы расцвілі агнямі святочнага феерверку. Заканчваўся знамянальны дзень — 7 лістапада 1967 года. Дзень, які азнаменаваў пяцідзесяты Кастрычнік на нашым велічным шляху да камунізма.

Па матэрыялах ТАСС і БЕЛТА.

На Цэнтральнай плошчы ў Мінску 7 лістапада 1967 года.

Фота Ул. КРУКА.



Вось яны, эпізоды нашай слаўнай гісторыі, паказаныя ў час тэатралізаванага марш-парада на дэманстрацыі працоўных у Мінску. Злева — адуць «конніні Будзённага»; справа — «1945 г. Берлін. Перамога».

ВЫСОКАЕ ПРЫЗНАННЕ НАРОДА

Ігар ВАСІЛЬЕЎ,
вучоны сакратар, член Прэзідыума Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР

Побач з Ленінскай прэміяй — як вышэйшай ацэнкай творчай працы — Дзяржаўная прэмія СССР увенчвае аўтараў найбольш таленавітых мастацкіх твораў, прасякнутых высокімі камуністычнымі ідэаламі, духам гуманізму.

Ёсць асаблівы сэнс у тым, што першае прысуджэнне нанова ўстаноўленых прэмій супала з Вялікай гадавінай — 50-годдзем Кастрычніка, што сама колькасць адзначаных высокай узнагародай работ значна перавысіла першапачаткова ўстаноўленую колькасць прэмій. У гэтым факце знайшоў яркае адлюстраванне росквіт культуры, апладатвораны ідэямі камунізма, выкліканай да жыцця рэальным развіццём новага, нябачанага яшчэ ў гісторыі, свету.

Пры самым строгім падыходзе з амаль ста прадстаўленых на атрыманне прэміі кандыдатаў было адабрана семнаццаць. Спіс адзначаных работ вылучаецца вялікай тэматычнай і жанравай разнастайнасцю. У ім прадстаўлены майстры розных пакаленняў многіх саюзных рэспублік. У цэлым ён пераканаўча дэманструе шырокую панараму дасягненняў савецкага многанацыянальнага мастацтва.

У галіне літаратуры Дзяржаўная прэмія СССР прысуджана аднаму з выдатных рускіх паэтаў Яраславу Смелякому за цыкл вершаў «Дзень Расіі». Гэты цыкл — сведчанне яркага ўзлёту таленту пісьменніка, які прайшоў трыццаціпяцігадовы шлях у літаратуры. Пясняр камсамольскіх будоўляў трыццатых гадоў, ён працягвае тэму энтузіязму моладзі ў сённяшніх вершах, усё больш пашыраючы дыяпазон сваёй творчасці. І ў апошнім цыкле Яраслаў Смелякоў прадстае як паэт яркай грамадзянскасці, якога глыбока асабіста хвалюе лёс народаў і рэвалюцыі. Тэматычна кніга шматпланавая: тут і будаўнікі Брацка і Іван Грозны, Рыхард Зорге і Дзяніс Давыдаў, камісары грамадзянскай вайны і Пушкін. Яркія кавалкі мазаікі складваюцца ў гістарычна рухомую карціну жыцця Радзімы. Яркая і самабытная мова Смелякова, які чэрпае магутнасць і сілу ў роднай зямлі, у самой гушчы народнага жыцця.

Дзяржаўнай прэміі СССР удастоены таксама зборнік вершаў народнай паэтэсы Латвійскай ССР Мірдзы Кемпе «Вечнасць імгненняў», які атрымаў шырокае прызнанне ў рэспубліцы і за яе межамі. Гэта — эмацыянальны вынік перажытага паэтэсай на працягу доўгага творчага шляху. Тэмы вызвалення Латвіі, нараджэння Савецкай рэспублікі спалучыліся з асабістымі перажываннямі жанчыны, якая ўсё навакольнае прапускае праз прызму сваёй душы. Кнігу вылучае высокая культура, мова пісьменніцы строгая, лаканічная і разам з тым па-народнаму вобразная і даходлівая. Сацыяльная тэматыка ў яе вершах амаль заўсёды выглядае інтымнай, павышаная цікавасць да падзей агульнанароднага значэння, да гісторыі заўсёды знаходзіць глыбока асабістае індывідуальнае тлумачэнне. Кніга Кемпе — сур'ёзнае дасягненне ўсёй савецкай паэзіі.

Сярод новых лаўрэатаў вядомы пісьменнік, вучоны, артыст Іраклій Андронікаў. Прэмія яму прысуджана за кнігу «Лермантаў. Даследаванні і знаходкі» — вынік шматгадовых пошукаў нястомнага прапагандыста творчасці вялікага паэта. Вялікую частку свайго жыцця пісьменнік прысвяціў раскрыццю невядомых старонак жыцця і творчасці Лермантава, стварыўшы захапляючы мастацкі расказ аб сваіх адкрыццях, пошуках, знаходках. Па сутнасці, Андронікаў стварыў зусім новы жанр у літаратуры, які ляжыць на скрыжаванні шляхоў навукі і мастацтва. Унікальны талент расказчыка абагаціў мову пісьменніка і самую будову яго кнігі. У ёй знайшлі адлюстраванне яркае ўяўленне мастака, тонкі густ майстра слова, вастрыня ўспрыняцця пільнага назіральніка і даследчыка.

У галіне тэатральнага мастацтва прэміяй адзначаны народны артыст Эстонскай ССР Каарэл Ірд. Ён больш як дваццаць гадоў кіруе Дзяржаўным акадэмічным тэатрам «Ванемуйне» ў горадзе Тарту. Дзякуючы яркаму мастацкаму таленту і няўрымслівай творчай энергіі Ірда тэатр «Ванемуйне» стаў адным з найбольш значных тэатральных калектываў нашай краіны. Карыстаючыся велізарнай папулярнасцю ў самага шырокага гледача, ён з'яўляецца ў той жа час «тэатрам-лабараторыяй», са спектакля ў спектакль сцвярджае сінтэтычную прыроду свайго мастацтва. У рэпертуары «Ванемуйне» прадстаўлены самыя разнастайныя сцэнічныя жанры: опера, драма, балет, аперэта.

Побач з рускай і зарубежнай класікай вялікае месца займаюць пастаноўкі п'ес сучасных драматургаў, і ўсё гэта адзначана яркай таленавітасцю, своеасаблівасцю рэжысёрскага почырку Каарэла Ірда, які ўмее надаць сваім спектаклям вострую грамадзянскасць, сучаснае светаадчуванне, сапраўдную народнасць. Гэтыя рысы ўласцівы і спектаклям, за пастаноўку якіх Каарэл Ірд адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР (трагедыя Шэкспіра «Карыялан», п'еса Ю. Смуула «Дзікі капітан», лірычная опера В. Торміса «Лебядзіны палёт» і яго ж харавы цыкл «Мужчынскія песні»).

Прысуджэнне Дзяржаўнай прэміі СССР рэжысёру Маскоўскага тэатра «Современник» Галіне Волчак, а таксама акцёрам тэатра Алегу Табакову і Міхаілу Казакову за спектакль «Звычайная гісторыя» (па творы Гончарова) знамянальна тым, што прэміі юбілейнага года побач з майстрамі мастацтва старэйшага і сярэдняга пакалення атрымліваюць прадстаўнікі аднаго з самых маладых сталічных тэатраў, таленавітыя прадаўжальнікі лепшых мхатаўскіх традыцый. Маладосць «Современника» не зніжае патрабавальнасці да яго. Гэты тэатр любяць за дух пастаянных творчых шуканняў. Галіна Волчак паставіла «Звычайную гісторыю» як спектакль аб краху чалавечай асобы, якая пайшла на кампраміс з сумленнем, гонарам, прыстойнасцю. Табакоў (Адуеў-малодшы) і Казакоў (Адуеў-старэйшы) з уласцівым ім талентам развенчваюць сваіх герояў, сцвярджаючы іх унутраную тоеснасць, толькі прыхрытую ў пачатку спектакля ўяўнай рамантычнасцю Адуева-малодшага. Гэтыя акцёры, добра вядомыя савецкаму гледачу па іх работах у тэатры і кіно, сцвердзілі сябе ў спектаклі «Звычайная гісторыя» сталымі мастакамі.

Прэміі ўдастоены таксама аўтар п'есы-інсцэніроўкі «Звычайная гісторыя» адзін з віднейшых савецкіх драматургаў Віктар Розаў. Ён вядомы як тонкі майстар псіхалагічнага малюнка, які нязменна ўзнімае ў сваіх творах важныя маральныя праблемы.

Імя Уладзіміра Частнакова, акцёра і мастацкага кіраўніка Ленінградскага акадэмічнага тэатра драмы імя А. С. Пушкіна, цесна звязана з увасабленнем на сцэне вобразаў нашых сучаснікаў. Заканамерным развіццём гэтага напрамку творчасці Частнакова з'явіўся яго зварот да вобраза У. І. Леніна. «Навальнічны год» Каплера, «Суровае шчасце» Міхайлава, «Кветкі жывыя» Пагодзіна, «Між ліўнямі» Штэйна, фільм «У дні Кастрычніка» — вось вехі Ленініяны Частнакова, якая па праву з'яўляецца выдатным дасягненнем нашага мастацтва. Увасабляючы на сцэне і на экране вобраз Леніна, Частнакоў аперыруе разнастайнымі тонкімі адценнямі свайго акцёрскага майстэрства, год ад году ўсё больш паглыблена раскрываючы ленінскі характар. Акцёр адыходзіць ад знешне-бытавых характарыстык, не імкнецца да дакладнага партрэтнага падабенства. Ён стараецца прынесці ў глядзельную залу веліч ленінскага духу, маштаб ленінскай думкі, сілу рэвалюцыйнага тэмпераменту. Частнакову ўдаецца ажывіць і ўнутрана напоўніць кожную прамову, кожны ўчынак Леніна, падкрэсліць сувязь думак, слоў, спраў Ільіча з тым, што адбываецца ў свеце, данесці да гледача адказнасць Леніна за ўсё, чым жыве планета.

Дзяржаўнай прэміі СССР удастоены яшчэ адзін твор нашага мастацтва, які развівае ленінскую тэму, — фільм «Ленін у Польшчы» (сцэнарый Яўгенія Габрыловіча і Сяргея Юткевіча. Рэжысёр — С. Юткевіч) вытворчасці кінастудыі «Масфільм» і творчага аб'яднання «Студыю» (Варшава). Аўтары фільма паставілі перад сабой задачу паказаць на экране працэс развіцця ленінскай думкі, матэрыялізаваць у экранным дзеянні глыбіні духоўнага інтэлектуальнага жыцця Леніна. Гэта задача бліскуча рэалізавана ў фільме. Кожная ленінская думка як бы нараджаецца на нашых вачах, тут, зараз, у гэтую ж хвіліну. Я. Габрыловіч, С. Юткевіч і праславлены выканаўца роляў Леніна Максім Штраух здолелі ўзнавіць ў фільме сам дух, стыль, манеру ленінскай думкі і гутаркі. Знешнія прыкметы жыцця на экране сціплыя, яны ахопліваюць замкнутую прастору — Пароніна, дом, турэмную камеру, яны абмежаваны ў часе — жнівень 1914 года, але веліч ленінскага духу рассоўвае гэтыя межы. Усё становіцца значным, маштабным, прыватнае замыкаецца ў адзін ланцуг з усеагульным, надзвычайным, тым, што адбываецца ва ўсім свеце. Фільм «Ленін у Польшчы» не толькі значны сам па сабе, ён абуджае да новых пошукаў, рухае наперад усё наша мастацтва.

Савецкаму гледачу добра вядомы фільм літоўскіх кінематаграфістаў «Ніхто не хацеў паміраць», які расказвае аб жыцці пасляваеннай літоўскай вёскі. Фільм вылучаецца эпічнай шырынёй у пастаноўцы агульначалавечых праблем, філасофскі-абагуленым гучаннем асноўных сюжэтных ліній. Удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР аўтар сцэнарыя і рэжысёр Вітаўтас Жалакявічус, аператар Іёнас Грыцюс, акцёры Данатас Баніёніс і Бруна Оя. Гэта — таленавіты творчы калектыў, які здолеў увасобіць

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Васіль МАТЭВУШАЎ

ВЕЧНАЯ ЗАРНІЦА

Табе, Радзіма, прадракалі,
Крывавым грозячы мячом,
Што пахаваеш свае далі
Пад дзікім горкім палыном,

Што над табой пагаснуць зоры,
Агні і сонца ў шыбах хат,
Асенняй скрухаю і горам
Імгла заслоніць далягляд.

А ты, развеяўшы туманы
І хмары чорных навальніц,
У твар глядзіш зачаравана
Жывых сярэбраных крыніц.

Глядзіш шчасліваю вяснянкай
На россыпы світальных рос,
У светлым лесе, капля ганка
На чысціню сваіх бяроз.

Глядзіш, як даспявае ніва
Пад звонкі голас жаўрукоў,
Як сонца плешчацца разлівам
На шыбах сёл і гарадоў,

Як караблям увысь да зорак
Дарога дальняя ляжыць,
Як над маёй зямлёй «Аўроры»
Зарніца вечная гарыць.

ВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ

АБЕЛІСК НА ШКОЛЬНЫМ ДВАРЫ

Гэта было перад самым святам 50-годдзя Кастрычніка. У двары полацкай школы № 7, залітым не пасеняму яркім сонцам, сабраліся па-святочнаму апранутыя вучні, настаўнікі, госці. Свежы вецер калыхаў сцягі і транспаранты, палотнішча на збудаванні, што ўзвышалася пасярод двара.

І вось пад жалобны марш аркестра і трэск аўтаматнага залпа спадае палотнішча—і перад вачыма прысутных вырастае абеліск...

А цяпер раскажам пра падзеі, што папярэднічалі ўрачыстасці.

У 1965 годзе чырвоныя следапыты школы пачалі пошук даваенных выпускнікоў. Знайшлі адзін адрас, другі, трэці... Завязалася перапіска. І вось у ліпені мінулага года ў школу на сустрэчу з'ехаліся яе былыя выхаванцы. З'ехаліся з усіх канцоў краіны—з Кандалакшы і Уфы, Варонежа і Мінска, Ленінграда і Вільнюса, Масквы і Львова.

Не пазнаць было ў пасівелых людзях былых школьнікаў. Па-рознаму склаўся іх лёс, розныя прафесіі выбралі яны сабе ў жыцці. Сямён Чыжык стаў кандыдатам тэхнічных навук, лаўрэатам Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій. Кандыдатам тэхнічных навук стаў Яўген Карасёў, пісьменнікам — Алесь Савіцкі. Навуковым супрацоўнікам Ленінградскага інстытута вакцын і сываратак працуе Людміла Агафонава—таксама кандыдат навук. Яе сястра Таня —інжынер. Прыехалі і мастакі, урачы, афіцэры Савецкай Арміі...

Аднакашнікі ўспомнілі добрым словам тых, каго няма ў жывых: многія былыя вучні загінулі смерцю храбрых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Былы камсорг школы Мікалай Соф'ін быў камсоргам часці. Дваццацігадовы старшы лейтэнант Уладзімір Тачынкін пад Ленінградам камандаваў артылерыйскім дывізіёнам. Загінулі і лётчык-знішчальнік Рыгор Топач, лейтэнант Сяргей Варонін...

У час сустрэчы і вырашылі увекавечыць памяць настаўнікаў і вучняў школы, якія аддалі жыццё за сённяшні светлы дзень...

І вось стаіць помнік-абеліск на школьным двары. Пабудавалі яго на грошы, сабраныя выпускнікамі школы, на грошы, выручаныя ад продажу металалому, сабранага вучнямі. Аўтары праекта—выхаванец школы маскоўскі мастак Аляксандр Гурэвіч і полацкі скульптар Мігель.

Знята палотнішча з помніка. На прыспушчаным сцягу з чырвонай мармуровай крошкі — словы «За нашу Савецкую Радзіму». На высокай пліце з шэрага мармуру бронзай напісана: «Настаўнікам і вучням школы № 7 (12), што загінулі ў баях за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.».

Пачынаецца мітынг. Выступаюць выпускнікі даваенных гадоў, былыя франтавікі. Яны ўспамінаюць імёны сяброў, што не дажылі да светлага дня Перамогі, аддалі сваё жыццё за тое, каб над роднай зямлёй заўсёды было чыстае неба, каб радасна гучаў дзіцячы смех.

Да падножжа абеліска кладуцца вянкі, жывыя кветкі. Вучні даюць клятву вернасці справе, за якую змагаліся іх бацькі і дзяды. Тут жа ганаровы грамадзянін Полацка Дэйніс уручаў камсамольскія білеты толькі што прынятым у рады ВЛКСМ.

Абеліск стаў свяшчэнным месцам для вучняў. Тут будуць збірацца першакласнікі на свой першы званок, а дзесяцікласнікі—на апошні. Тут будуць уручаць значкі акцябратам, гальштукі—піянерам, камсамольскія білеты—камсамольцам.

А. ТАРЛЕР,
юрыст, былы выхаванец школы № 7 г. Полацка.

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ ВУЧЫЦЬ

ДА ВЫНІКАЎ ГРАМАДСКАГА АГЛЯДУ БІБЛІЯТЭК

Закончыўся грамадскі агляд бібліятэк рэспублікі, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. У ім прыняло ўдзел больш пятнаццаці тысяч бібліятэк—сістэмы Міністэрства культуры, школьных, тэхнічных, медыцынскіх, прафсаюзных, навучальных устаноў і іншых ведамстваў.

Грамадскі агляд актывізаваў дзейнасць бібліятэк. У чытальныя залы і на абанементы прыйшло 150 тысяч новых чытачоў, і цяпер бібліятэкі рэспублікі абслугоўваюць амаль пяцімільённую армію аматараў кнігі.

Сярод бібліятэк шырока разгарнулася спаборніцтва за выдатнае абслугоўванне чытачоў. Цікавая і плённая работа праводзіцца ў Горацкім раёне. Тут ужо амаль усё пісьменнае насельніцтва чытае бібліятэчныя кнігі. Значна павысіўся агульны ўзровень работы бібліятэк.

Добра працуюць бібліятэкі Крупскага раёна. Усе яны размешчаны ў дабротных дзяржаўных або калгасных будынках. 175 бібліятэк раёна абслужылі сёлета 40 тысяч чалавек. У сяраднім кожны чытач прачытаў 18 кніг. Прапагандзе кнігі спрыялі канферэнцыі чытачоў, кніжныя выстаўкі, выпушчаныя бібліятэкай плакаты. У кожнай бібліятэцы раёна адкрыты куткі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, афармлены календары рэвалюцыйных падзей.

Значных поспехаў дамагліся бібліятэкі Брагінскага, Дзятлаўскага, Пухавіцкага, Талачынскага, Дзяржынскага і іншых раёнаў, гарадскія бібліятэкі ў Мінску, Маладзечна, Бабруйску і Магілёве.

Як адметную рысу года трэба адзначыць тое, што намнога палепшылася прапаганда палітычнай літаратуры, асабліва твораў У. І. Леніна. Маладзечанская цэнтральная гарадская бібліятэка імя Крупскай стала праводзіць сумесна з гаркомамі партыі і камсамола ленінскія і кастрычніцкія чытанні. Для прапаганды твораў У. І. Леніна і літаратуры аб ім тут шырока выкарыстоўваюцца выяўленчыя матэрыялы, дакументальныя фільмы, грамзапісы з выступленнямі Уладзіміра Ільіча, наладжваюцца сустрэчы чытачоў са старымі бальшавікамі.

Наогул новых форм прапаганды кнігі сёлета выкарыстана многа. Гэта і ўжо названыя ленінскія і кастрычніцкія чытанні, і конкурсы на лепшага чытальніка-выканаўцу твораў, прысвечаных Леніну і Кастрычніцкай рэвалюцыі, і святы юнацтва, і навукова-практычныя канферэнцыі, і бібліятэчныя «агеньчыкі»-вечары, на якіх адбываюцца сустрэчы моладзі са старымі бальшавікамі, героямі Вялікай Айчыннай вайны і першых пяцігодак, арганізатарамі калгасаў і саўгасаў. Асабліва цікава гэтыя мерапрыемствы праходзяць у бібліятэках Лепельскага і Брагінскага раёнаў.

Работнікі многіх бібліятэк пішуць гісторыі сваіх устаноў культуры, калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў. Ажывілася работа бібліятэчных саветаў, кніганош. Напрыклад, толькі ў Гродзенскай вобласці актывісты абслугоўваюць звыш 120 тысяч чытачоў.

За час агляду ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база многіх бібліятэк. Звыш двухсот з іх (галоўным чынам сістэмы Міністэрства культуры) атрымалі новыя добраўпарадкаваныя памяшканні, амаль для чатырохсот набыта новая мэбля. Пакінулі прыватныя памяшканні больш за 150 сельскіх бібліятэк. Ужо ў многіх раёнах калгасы будуюць для бібліятэк памяшканні за свой кошт, вялікія сродкі выдзяляюць на кнігі і абсталяванне. Толькі ў адным Горацкім раёне на гэта выдзелена арцелямі 170 тысяч рублёў.

Новыя цудоўныя будынкі атрымалі бібліятэка Акадэміі навук БССР, Віцебская і Магілёўская абласныя бібліятэкі. Узводзяцца сапраўдныя палацы кнігі для Брэсцкай і Мінскай абласных бібліятэк. Усё гэта радасныя падзеі ў культурным жыцці рэспублікі.

Сціплую, але высакародную працу нашых прапагандыстаў кнігі цэняць партыя і ўрад. 16 бібліятэкараў сёлета ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Загадчыцы Дашкаўскай сельскай бібліятэкі М. Барадзінскай уручан ордэн Леніна. За добрую арганізацыю бібліятэчнай справы ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны І. Арэхаўская—загадчыца Мінскай гарадской бібліятэкі № 5, І. Алексіевіч—загадчык Крупскай раённай бібліятэкі, М. Германовіч — загадчыца Талачынскай раённай бібліятэкі.

У рэспубліцы зараз налічваецца 386 бібліятэк выдатнай работы. Толькі за час агляду гэта ганаровае званне прысвоена яшчэ 160 бібліятэкам. Абласныя аркамітэты ў час агляду ўзнагародзілі дыпломамі і грашовымі прэміямі 230 бібліятэк. Прэміраваны таксама лепшыя бібліятэкі сістэмы Міністэрстваў сельскай гаспадаркі і аховы здароўя, тэхнічныя бібліятэкі, Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры ўзнагародзілі дыпломамі 243 бібліятэкі і Ганаровымі граматамі—250 бібліятэчных работнікаў і актывістаў. Рэспубліканскі аркамітэт адзначыў 46 лепшых бібліятэк рэспублікі, у іх ліку Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У. І. Леніна, фундаментальную бібліятэку імя Я. Коласа Акадэміі навук БССР, бібліятэку Беларускай сельскагаспадарчай Акадэміі, Маладзечанскую цэнтральную гарадскую, Магілёўскую абласную, Астрамечаўскую, Талькаўскую, Дашкаўскую, Гальшанскую і іншыя сельскія бібліятэкі.

Агляд таксама выявіў у рабоце бібліятэк многа і недахопаў, над іх ухіленнем і давядзецца працаваць. Трэба па крупінках сабраць усё каштоўнае, перадавое, што нарадзілася ў лепшых нашых бібліятэках, абагуліць іх вопыт, зрабіць яго здабыткам шматтысячнай армі бібліятэкараў рэспублікі.

Многа давядзецца зрабіць, каб лепш арганізаваць узаемадзеянне абласных, гарадскіх, прафсаюзных і тэхнічных бібліятэк, палепшыць камплектаванне кніжных фондаў, асабліва сельскіх бібліятэк, больш рацыянальна размясціць самую сетку бібліятэк.

Нядаўна зацверджана сумеснае палажэнне Міністэрства культуры БССР і Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў аб арганізацыі адзінай сеткі масавых бібліятэк у горадзе і на вёсцы. Палажэнне прадугледжвае агульнымі намаганнямі распрацаваць планы ўпарадкавання існуючых і адкрыцці новых бібліятэк у кожным горадзе і раёне. Упарадкаванне бібліятэчнай сеткі ў рэспубліцы будзе праведзена на працягу 1967—1969 гадоў.

Ганаровая праца бібліятэкара ў нашай краіне. І мы павінны стварыць усе ўмовы, каб кніга знайшла шырокую дарогу да чытача, дапамагала савецкім людзям жыць і працаваць.

Н. КРУПЕНЬКА,
начальнік бібліятэчнай інспекцыі Міністэрства культуры БССР.

РЭВАЛЮЦЫЯЙ МАБІЛІЗАВАНЫ

З Кузьмой Мікалаевічам Ганічэнкам мы пазнаёміліся напярэдадні Кастрычніцкага свята на сходзе старых камуністаў Ленінскага раёна сталіцы. Я крыху прыпазніўся, і калі зайшоў у пакой, дзе сабраліся ветэраны, там было ўжо паўнютка.

Старшынствуючы адкрыў сход. Выгляд у яго быў вельмі ўрачысты, і хутка я зразумеў чаму...

— Перш чым перайсці да нашых спраў, — сказаў ён, — дазвольце ад вашага імя павіншаваць Кузьму Мікалаевіча Ганічэнку з васьмідзесяцігоддзем.

З крэсла ў кутку пакоя падняўся высокі хударлявы мужчына з вузкім маладжавым тварам і пакланіўся. Выглядаў ён самае большае на шэсцьдзесят. Я ўспомніў тэлефонную размову за дзень да сходу са старшынёй раённага савета старых камуністаў Іванам Данілавічам Паўлавым. Гэта ён мне і параіў пазнаёміцца з Ганічэнкам. Я спытаў, ці ў добрым здароўі гэты таварыш, каб прыняць карэспандэнта. У трубцы засмяяліся:

— Ды Кузьма Мікалаевіч бегае, як малады. Вунь толькі з камандзіроўкі прыехаў...

...Старшыня зачытаў прывітальны адрас.

Было ў ім многа прачулых харошых слоў пра юбіляра. А ён стаяў крыху схіліўшы галаву і час ад часу пакачваў ёю, нібы не верачы, што ўся гэтая цырымонія мае да яго дачынення.

...Я сяджу ў кватэры Ганічэнкі і разглядаю старыя фатаграфіі. Вось пажоўклая ад часу картка. Ля ваеннай двухколкі група салдат.

— Пазнаяце? — Кузьма Мікалаевіч паказвае на аднаго з салдат. — Я. У канцы шаснаццатага года, на фронце. Да нас павінен быў цар прыехаць, дык рыхтаваліся... Афіцэр'ё з ног збілася. Пад гарачую руку не трапляйце — на зубах атрымаеш. Чысціліся мы, мыліся, хвасты коням расчэсвалі... Нарэшце, прыехаў. Ходзіць, як сонны, нага за нагу чапляецца. Прайшоў перад войскамі, пасля мы перад ім. А праз дзень зноў старая акопная жытуха пачалася... Ды не той гайшоў салдат у канцы тысяча дзевяцьсот шаснаццатага... Гэта ж раней і ўявіць немагчыма было, каб на цара ды якім словам... А тут, паехаў Мікалай, дык услед яму і так, і гэтак. Дужа ж абрыдла вайна! А праз некалькі месяцаў Лютаўская рэвалюцыя. Замітынгавала Расія. У нас адзін мітынг не паспее скончыцца—другі пачынаецца...

— Во, во... Многім афіцэрам лютаўскія падзеі прыйшліся па сэрцу. Ну, а нам, салдатам-бальшавікам, трэба было павярнуць салдацкую масу на свой бок...

Я слухаю Кузьму Мікалаевіча і лёгка ўяўляю, як гэты энергічны хлопец з-пад Царыцына раздае ў акопах бальшавіцкія лістоўкі. На адным з мітынгаў хлопца выбіраюць старшынёй палкавога салдацкага камітэта, пасля — камісарам корпуса. І камандуе ён васьмюдзесяццю тысячамі салдат разам з генералам — камандзірам корпуса.

— Трошкі адукацыяй генерал мяне апярэдзіў, — усміхаецца Кузьма Мікалаевіч. — У мяне царкоўна-прыходская школа, у яго — акадэмія. Але нічога, слухалі салдаты мяне больш, чым яго.

Восенню семнаццатага года корпус перавялі з Карпат у Гатчыну. Адзін за адным прыязджаюць да салдат эмісары Часовага ўрада агітаваць за вайну. Керанскі прыязджаў, нават прадстаўнік французскіх сацыялістаў — Францыа Тома. Але сімпатыі, настрой салдат усё больш схіляліся да бальшавікоў. У кастрычніку карпусны камітэт выносіць рэзалюцыю: «Далоў Часовы ўрад, уся ўлада Саветам!»

Камітэт пасылае 125 салдат на чале з камісарам корпуса на дапамогу піцерскім рабочым.

— Мы прыбылі ў Смольны вечарам 25 кастрычніка, — успамінае Кузьма Мікалаевіч. — Прыняў нас таварыш Падвойскі. «Пакуль размяшчайцеся тут, — гаворыць, — як спатрэбіцеся — скажам».

Спатрэбіліся мы праз некалькі гадзін. Ноччу на грузавіках адвезлі нас на адну вуліцу. Там ужо поўна было людзей —рабочых, матросаў, салдат... І што мне асабліва запомнілася — настрой. Такі ва ўсіх быў радасны, святочны настрой, нібы на маёўку ішлі, а не на крывавы бой.

Пачулася камада, і мы пайшлі. Спачатку крокам, потым усё хутчэй, хутчэй. Кожны спяшаўся перагнаць суседа, і вось ужо ўся маса народа бегла па вуліцы. Толькі чуваць быў тупат ног... Пасля ўжо, успамінаючы ўсё гэта, я падумаў — во дзе хапіла страху тым, хто не спаў, сядзеў у гэты час, прытаіўшыся, ля вокнаў...

Выбеглі на Дварцовую плошчу. Народу там — мора! Крыкі, стрэлы... Усім натоўпам уварваліся ў палац. Нехта крыкнуў: давай у Блакітную залу! Падбеглі да дзвярэй — зачынены. Падналіснулі плячыма, уварваліся ў залу і... назад! Усяго чакалі, толькі не гэтага — не зала, а хлеў сапраўдны: на падлозе салома, гразь, паветра —хоць працівагаз надзявай. На саломе некалькі жанчын у вайсковай амуніцыі лемантуюць. Высветлілася потым, што гэта апора Керанскага — жаночы батальён Бачкаровай...

Кузьма Мікалаевіч усміхаецца.

...Праз тры дні пасля ўзяцця Зімняга вярнуўся Кузьма Мікалаевіч у корпус. Не паспеў прыйсці ў казармы, як аказваецца, што ў гарадскім тэатры мітынг, і што мітынг гэты афіцэры арганізавалі. Паімчаў камісар у тэатр, запасным ходам прабраўся на сцэну. Бачыць, на трыбуне афіцэр чытае рэзалюцыю ў падтрымку Часовага ўрада... Кузьма Мікалаевіч крычыць у залу: «У Піцеры Савецкая ўлада перамагла! Даёш рэзалюцыю ў падтрымку Савецкай улады!».

Да камісара кінулася некалькі чалавек, скруцілі рукі, цягнулі за кулісы.

— Біць пачалі, сукіны дзеці. А ў зале, чую, крык стаіць — за што, маўляў, салдата б'юць... Вырваўся я — малады ж і здаровы быў — і зноў на сцэну, зноў за сваё: прапаную, кажу, рэзалюцыю ў падтрымку Савецкай улады... Тут як грымне зала «Ура!», як падхопіць мяне на руплі...

Кузьма Мікалаевіч падымаецца з крэсла і пачынае хадзіць па пакоі. Твар яго пачырванеў, вочы па-маладому блішчаць. Я крыху палохаюся, каб не пашкодзіла чалавеку хваляванне — восемдзесят гадоў, не жартачкі.

— Ды што вы! — махае рукой гаспадар. — Мне такія ўспаміны толькі бадзёрасці даюць. І на старасць забываюся...

Мабілізаваны рэвалюцыяй, паехаў Кузьма Мікалаевіч у васемнаццатым годзе ўстанаўліваць Савецкую ўладу ў Паволжы. Быў старшынёй Мікалаеўскага павятовага камітэта партыі. Адначасова ўзначальваў камбедаўскі атрад. Потым працаваў памочнікам губеранскага продкамісара. У Петраградзе і Маскве рабочыя жылі на асмушцы хлеба. Голад пагражаў рэвалюцыі. І вось тут, на Волзе, ішла барацьба за хлеб.

— Зарабіць кулю тады было вельмі проста, — усміхаецца Кузьма Мікалаевіч. — Аднойчы, калі забіралі лішкі хлеба ў нямецкіх каланістаў, наш невялічкі атрад раззброілі, учынілі самасуд. Ужо да сценкі паставілі, как расстраляць. Ды пашанцавала нам — падаспелі ў гэты момант нашы.

Потым царыцынскі фронт. Пасля фронту зноў Кузьма Мікалаевіч здабывае для рэвалюцыі хлеб. Потым...

— Неяк выклікалі мяне ў губком і прапануюць пайсці працаваць у ахову здароўя. У мяне аж язык адняўся. У мяне ж, кажу, пачатковая адукацыя. Нічога, адказваюць, урачы ў нас ёсць, патрэбен камуніст, які б кіраваў. Так стаў я загадчыкам губеранскага аддзела аховы здароўя. А неўзабаве паслала партыя на прафсаюзную работу, потым зноў на гаспадарчую...

Партыя паслала... Гэтыя два словы часта паўтараюцца ў расказе Кузьмы Мікалаевіча. Па загаду партыі ён ехаў у нязведаны край, браўся за любую работу. Паволжа, Украіна, Алтай, зноў Украіна... У 1936 годзе Кузьма Мікалаевіч скончыў сельскагаспадарчы інстытут і пасля гэтага амаль чвэрць стагоддзя папрацаваў аграномам.

На восьмым дзесятку пайшоў стары камуніст на адпачынак. Ды і ці адпачынак гэта? У Беларусі ён жыве крыху больш года (прыехаў жыць да дзяцей) і ўжо аб'ездзіў з лекцыямі, дакладамі амаль усю рэспубліку. Я гартаю папку з водгукамі, пісьмамі... Вось копія адрасаванага ў ЦК КПБ водгуку, напісанага Полацкім гаркомам партыі. «...Полацкі ГК КПБ выказвае падзяку і думку ўсіх палачан, прыносіць глыбокую падзяку члену КПСС з 1918 года, ветэрану грамадзянскай вайны і станаўлення Савецкай улады К. М. Ганічэнку за тое высокае пачуццё партыйнай адказнасці, з якім ён выконваў даручэнне ЦК КПБ — выступаў перад працоўнымі горада...»

Яшчэ дзесяткі водгукаў з воінскіх часцей, школ, заводаў, устаноў...

Я слухаю і думаю пра тое, што такія людзі лічаць сябе мабілізаванымі рэвалюцыяй на ўсё жыццё. Гэта пра іх словамі лужанінскага верша «Партыі» сказана:

Гукнеш— адзавуся, твой просты
салдат на паверцы.
Пашлеш — дамагуся, здабуду
яшчэ перамогу.
Не ўся цаліна абудзілася ў
стэпах і ў сэрцах,
Дык вочы—на компас, а рукі —
на руль.
І ў дарогу!

М. ЗАМСКІ.

ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА З ГЛЕДАЧОМ

Жыццё фільма пачынаецца з першай сустрэчы з гледачом. Потым яго паглядзяць тысячы, дзесяткі тысяч людзей, але для стваральнікаў фільма першая сустрэча заўсёды незабыўная.

У святочныя дні ў кінатэатры «Піянер» быў паказаны фільм «Анюціна дарога», пастаўлены на кінастудыі «Беларусфільм» па сцэнарыі Кастуся Губарэвіча. Рэжысёр — Л. Голуб. Здымаў карціну Ю. Цвяткоў. Гэта, дарэчы, яго першая самастойная работа. Мастак — Ю. Булычоў, якога з Голубам звязвае даўняя дружба: яны разам стваралі карціны «Дзяўчынка шукае бацьку», «Пушчык едзе ў Прагу» і інш. Галоўную ролю ў «Анюцінай дарозе» выконвае пяцігадовая Света Карасцеліна.

Гэта фільм аб першых гадах маладой Савецкай краіны, аб мужных людзях, аб іх веры ў будучае, якую яны перадалі і сваім дзецям.

Першыя гледачы гарачымі апладысментамі ўзнагародзілі новую работу беларускіх кінематаграфістаў.

ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Актыў чытачоў Тураўскай занальнай бібліятэкі сумесна з работнікамі жыткавіцкай раённай газеты «Новае Палессе» правялі завочную канферэнцыю чытачоў па раману І. Гурскага «Вецер веку». Удзельнікі яе падзяліліся на старонках газеты сваімі ўражаннямі аб рамане. Быў змешчаны таксама артыкул І. Гурскага аб тым, як ён працаваў над кнігай.

Я. АЛЬБЯРСОН,
загадчык Тураўскай занальнай бібліятэкі.

ВЫСТАЎКА Ў СВЕТЛАГОРСКУ

У лектарскай зале Дома культуры энергетыкаў адкрыта выстаўка мастакоў-светлагорцаў. На ёй прадстаўлены 80 работ жывапісу, графікі і скульптуры. Асаблівым поспехам карыстаюцца творы Уладзіміра Юміраха, Віктара Баранава, Мікалая Дакучаева.

Л. БАЛДУЕЎ.

КАЛІ Ў ДОМЕ ГУЧЫЦЬ МУЗЫКА

З пошты «ЛіМа»

Задоўга да таго, як у Аршанскай музычнай школе пачаўся новы навучальны год, у нас у кватэры пачуўся тэлефонны званок. Педагог Людміла Уладзіміраўна Шлянская запрашала да сябе нашу дачку Іду—вучаніцу 6-га класа, цікавілася, як яна «ўваходзіць у форму».

Калі ў кватэры ў нас гучаць Чайкоўскі, Моцарт, Бах і Шастаковіч, я з асаблівай удзячнасцю думаю пра Людмілу Уладзіміраўну, чалавека, які любіць музыку, умее запаліць гэтую любоў у дзяцей.

Са сваімі выхаванцамі Л. Шлянская працуе вельмі сур'ёзна, укладаючы ў кожны ўрок карпатлівую працу. У гэтым сакрэт поспехаў такіх вучаніц, як Таня Лічко, Лена Лімантава і многіх іншых.

Нядаўна Аршанская гарадская музычная школа атрымала цудоўны будынак. Сёлета ўвосень адкрылася вячэрняе аддзяленне. У школу прыйшлі новыя педагогі. Ёсць сярод іх выхаванцы Людмілы Уладзіміраўны. Як гэта прыемна: бачыць, што дае парасткі пасеянае табой зерне.

С. ПАЛАВІЦКАЯ,
/рач.

І МУЗЫКА, І МАЙСТАР

Відаць, усе ў Чэрвені ведаюць пенсіянера І. Лычкоўскага, яго напоўнены музыкай дом. Іван Іосіфавіч грае на баяне, цымбалах, дудцы, кіруе аркестрам народных інструментаў горада, чые канцэрты не раз слухалі ў калгасах і саўгасах раёна, у Беразіно і Мінску.

Але Іван Іосіфавіч не толькі цудоўны музыка. Ён і выдатны майстра—сам робіць цымбалы і дудкі. На рэспубліканскай дэкадзе самадзейнага мастацтва ў Мінску многія спецыялісты, якія слухалі ігру дударо́ў, захапляліся меладычнасцю і гучнасцю інструментаў. Пасля канцэрта да Лычкоўскага падышоў прадстаўнік Расійскай Федэрацыі і папрасіў:

— Зрабіце нам партыю такіх дудак.

Іван Іосіфавіч выканаў заказ. Сібірскія артысты атрымалі з Чэрвеня дудкі.

А. ПЛЯШЭВІЧ.

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

БЕРАЎ Маісей Залманавіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Адзін са старэйшых беларускіх кінааператараў-дакументалістаў. Прыйшоў на Мінскую студыю пасля заканчэння мастацкага тэхнікума ў Віцебску (1930) і інстытута кінематаграфіі ў Маскве (1934). Зняў сотні сюжэтаў для кінаперыёдыкі, дзесятні навукова-папулярных і храніка́льна-дакументальных фільмаў. У час вайны працаваў франтавым кінаператарам, здымаў эпізоды з баявой дзейнасці партызан. У. М. Берава вучыліся многія беларускія аператары малодшага пакалення.

ЗАБАЛОЦКІ Анатоль Дзмітрыевіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. На студыі «Беларусьфільм» з 1959 года, пасля заканчэння Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі. Зняў навелы «Камбуд», «Зорка на спражцы», поўнаметражныя мастацкія фільмы «Апошні хлеб», «Праз могілкі», «Альпійская балада».

КАРПІЛАЎ Віктар Рыгоравіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1949 годзе, працаваў у розных тэатрах краіны. З 1956 года — рэжысёр Беларускай студыі тэлебачання. Стварыў рад тэлевізійных спектакляў, якія вызначаюцца высокімі ідэйна-мастацкімі якасцямі («Крах», «Сэрца на далоні», «Не верце цішыні» і інш.). Аўтар і пастаноўшчык беларускіх выпускаў «Блакітнага агеньчыка», рэжысёр тэлечасопісаў «Мастацтва», «Літаратурная Беларусь». Перанёс на тэлеэкран больш дваццаці тэатральных спектакляў.

КУЗНЯЦОЎ Іван Іванавіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Кампазітар, аўтар папулярных вакальна-харавых твораў. Вядомасць набылі яго кантаты «Палі стапавыя», «Гімн Радзіме і чалавеку-творцу», «Ленін», сюіта «У родным краі», песні «Нас вітае Ленін», «Да яснае мэты», «Мы за партыяй родная ідзём», «Песня пра Мінск», «Зямля мая зялёная» і інш. Творы кампазітара ўвайшлі ў рэпертуар Акадэмічнай харавой капэлы, Дзяржаўнага народнага хору БССР, ансамбля песні і танца БВА, шматлікіх самадзейных калектываў.

ЛЕЙТМАН Леў Мееравіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Адзін са старэйшых беларускіх мастакоў. Вучыўся ў Ю. Пэна ў Віцебску, у майстэрнях прафесара Ю. Бершадскага ў Адэсе і на курсах Усерасійскай акадэміі мастацтваў у Ленінградзе. Шмат гадоў аддаў педагагічнай дзейнасці, быў адным са стваральнікаў Мінскага мастацкага вучылішча. На выстаўках выступае з 1930 года. Вядомасць набылі многія яго туашы, кісталгравюры, лінагравюры, акварэлі. Плённа працуе і ў галіне кніжнай графікі. Старшыня секцыі акварэлістаў Саюза мастакоў БССР.

ПАПЛАЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. У 1952 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па дырыжорска-харавому і гісторыка-тэарэтычнаму факультэтах. З таго часу працаваў хормайстрам, галоўным хормайстрам, дырыжорам Дзяржаўнага народнага хору і Акадэмічнай харавой капэлы БССР. Зараз — музычны кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору БССР і выкладчык Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Шмат працуе для калектываў мастацкай самадзейнасці. Падрыхтаваныя ім хор вёскі Азэрышчына Гомельскай вобласці атрымаў званне лаўрэата на Шостым сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве, калектыў калгаса «Сцяг Саветаў» Навагрудскага раёна паспяхова выступіў на ВДНГ, Смаргонскі ансамбль песні і танца — на Крамлёўскай сцэне, у Зорным гарадку, на гастролях у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы і Польшчы.

БАЧЫЛА Аляксандр Мікалаевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Штодзённыя пазыўныя Беларускага радыё — песня кампазітара У. Алоўнікава на словы Алеся Бачылы «Радзіма, мая дарагая». Лібрэта А. Бачылы «Яснае світанне» атрымала трэцюю прэмію на рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным 40-годдзю Савецкай улады. У 1960 годзе паэт напісаў лірычную драму «Калючая ружа», паводле якой кампазітар Ю. Семяняка стварыў оперу. Тэатр оперы і балета БССР рыхтуе зараз да пастаноўкі новую оперу Ю. Семяняні на лібрэта А. Бачылы — «Калі ападае лісце». Папулярнасць заваявалі многія песні на словы паэта.

КАЛІТОЎСКАЯ Клаўдзія Фёдараўна, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыла музычнае аддзяленне Мінскага харэаграфічнага вучылішча ў 1931 годзе. Займалася ў студыі, на базе якой быў створаны тэатр оперы і балета Беларускай ССР. Да 1937 года — салістка тэатра тэатра, потым салістка тэатра оперы і балета Казахскай ССР. З 1945 года зноў у родным калектыве. У 1951 годзе ўзначаліла Мінскае дзяржаўнае харэаграфічнае вучылішча. Выхаванцы вучылішча складаюць аснову балетнай трупы тэатра оперы і балета, паспяхова выступаюць на сцэнах іншых тэатраў краіны.

КАЛАНДЗЕНАК Анатоль Іосіфавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Да вайны — артыст аркестра Мінскага цырка і тэатра юнага гледача, навучэнец Мінскага музычнага вучылішча. У час вайны — разведчык 1-й Мінскай партызанскай брыгады. Пасля — загадчык сельскай бібліятэкі, кіраўнік калектыву самадзейнасці. У 1953 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. Працаваў выкладчыкам і дырэктарам Мінскага музычнага вучылішча, артыстам Дзяржаўнага народнага і Дзяржаўнага сімфанічнага аркестраў БССР. З 1959 года — дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

МІХАЛЮТА Іван Францавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. У час вайны — палітрук роты, потым камісар партызанскага атрада. Працаваў на партыйнай рабоце, пасля начальнікам аддзела мастацтва і намеснікам начальніка абласнога ўпраўлення культуры. З 1958 года — дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Скончыў завочна Маскоўскі дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва.

ПРЖЫБЫТКА Міхаіл Іванавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Больш чатырох дзесяткаў гадоў працуе машыністам сцэны тэатра імя Янкі Купалы. Дабіўся выдатнай работы пастановачнай часткі. У час гастроляў купаўлаўцаў у Маскве ў 1940 і 1955 гадах быў узнагароджаны медалямі «За працоўную адзнаку», у 1957 годзе—значком Міністэрства культуры БССР «За выдатную працу».

АЛЯКСАНДРАЎ Сямён Іосіфавіч, заслужаны артыст БССР. Спецыяльную адукацыю атрымаў у Горкім. Працаваў у розных тэатрах краіны. З 1959 года — артыст Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. За восем гадоў стварыў на гродзенскай сцэне нямала яркіх, шматгранных вобразаў. С. Аляксандраў выконваў ролю Радзіёнава ў «Порт-Артуры», Кузьмы ў «Драме на паляванні», маёра ў «Дамах і гусарах», Галая ў «Абуджаным сумленні».

БУРКОВІЧ Веніямін Антонавіч, заслужаны артыст БССР. Адзін з праслаўленых майстроў беларускіх цымбалаў. Скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1963). З 1952 года артыст Беларускай філармоніі. На Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве ў 1957 годзе атрымаў залаты медаль. У тым жа годзе ўзнагароджаны залатым медалём за перамогу на Усесаюзным мастацкім конкурсе. Выступаў з канцэртамі ў Нарвегіі, Швецыі, Бельгіі, Манголіі, Канадзе і іншых краінах.

ВУЯЧЫЧ Віктар Лук'янавіч, заслужаны артыст БССР. Працаваў салістам Дзяржаўнага народнага хору БССР, Беларускага радыё і тэлебачання, ансамбля песні і танца БВА. Цяпер саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У 1966 годзе на Усесаюзным конкурсе савецкай песні заняў першае месца. У 1967 годзе заваяваў званне лаўрэата на Міжнародным фестывалі эстраднай песні ў Балгарыі.

ГУР'ЕЎ Віктар Фёдаравіч, заслужаны артыст БССР. Імя В. Гур'ева ўпершыню з'явілася на афішах у 1960 годзе, калі ён пасля заканчэння Беларускай кансерваторыі быў прыняты ў трупу Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларускай ССР. Выконваў рядучыя партыі ў беларускіх операх «Яснае світанне» і «Алеся». Спяваў партыі князя ў оперы «Русалка», Лынава ў оперы «Царская нявеста», Арэста ў оперы «Арэстэя». Папулярны як выканаўца партый Хазэ («Кармэн») і Манрыка («Трубадур»).

ЯФРЭМЕНКА Аляксей Антонавіч, заслужаны артыст БССР. Да вайны працаваў акцёрам Барысаўскага калгасна-саўгаснага, потым Пінскага драматычнага тэатраў. З 1945 года — артыст Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра. Гледачы ведаюць А. Яфрэменку як выканаўцу роляў геройчнага плана — Маісея ў «Іспанцах», камандзіра флагмана — у «Пагібелі эскадры», матроса Салаўёва ў «Разломе». Вядомасць прынесла акцёру і вы

НОВАЕ ВЫДАННЕ КОЛАСАЎСКАЙ СПАДЧЫНЫ

Ушаноўваючы памяць Якуба Коласа, Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку прыняў пастанову аб выданні да 90-годдзя з дня нараджэння паэта новага Збору яго твораў. Гэтае рашэнне ўзрадавала і нашу грамадскасць, і шматлікіх сяброў у братніх рэспубліках і за мяжой.

Творчасць Якуба Коласа—яркая старонка ў гісторыі беларускай культуры, мастацкі летапіс жыцця беларускага народа, натхнёнае ўвасабленне думак, пачуццяў і спадзяванняў беларуса. Свет Коласа—гэта невычарпальная мастацкая скарбніца.

Новы Збор твораў Я. Коласа будзе рыхтаваць Інстытут літаратуры Акадэміі навук БССР, які ўжо мае пэўны вопыт навуковага выдання беларускай літаратурнай класікі. Тэксталагічная група інстытута рыхтавала ў 1961—1964 гадах дванаццацітомны Збор твораў Якуба Коласа—выданне, якое хутка разышлося.

Новы Збор твораў, падрыхтоўчая праца над якім ужо распачата, не будзе механічным паўтарэннем выдання 1961—1964 гадоў. Ён будзе большы па аб'ёму, па колькасці тамоў і друкаваных аркушаў і значна шырэй прадставіць коласаўскую спадчыну. У выданне будуць уключаны пісьмы Коласа, публіцыстычныя артыкулы, навукова-метадычныя працы. Мяркуецца, што будуць уключаны ў яго раннія вершы і апавяданні Коласа, фальклорныя запісы, зробленыя пісьменнікам у час вучобы ў семінарыі, «Методыка роднай мовы», першая рэдакцыя «Сымона-музыкі», а таксама многія іншыя творы і матэрыялы, якія па розных прычынах не былі змешчаны ў папярэднім выданні. Складальнікі апрацавалі каля трохсот Коласавых пісьмаў, многія з якіх яшчэ не друкаваліся.

У пятнаццацітомным Зборы твораў Якуба Коласа будзе змешчана каля тысячы яго твораў малых жанравых форм, усе яго шырока вядомыя паэмы, аповесці, драматычныя творы, пераклады, больш за дзвесце публіцыстычных і крытычных артыкулаў, дзённікавыя запісы, каля васьмісот пісьмаў...

Адносна будучага Збору твораў былі розныя меркаванні. Прапаноўвалася, напрыклад, каб гэта быў Поўны збор твораў. Думаецца, аднак, што гэта пакуль што немагчыма зрабіць хоць бы таму, што яшчэ не ўсё напісанае Я. Коласам сабрана. Распачынаць падрыхтоўку да поўнага выдання, безумоўна, трэба ўжо цяпер, не адкладаючы на будучае. Новае выданне якраз і разглядаецца тэкстолагамі-коласаўцамі як адзін з этапаў падрыхтоўкі Поўнага збору.

Не паўтараць зробленага, не задавальняцца дасягнутым—вось што павінна стаць дэвізам працы над новым выданнем. Пошукі найбольш дасканалай кампазіцыі выдання і кожнага тома, рацыянальных спосабаў падачы дапаможнага матэрыялу—усё гэта задачы нялёгкія.

Праспект Збору твораў прадугледжвае павелічэнне аб'ёму першапачатковага аўтарскага тэксту, які ў выглядзе варыянтаў і розначытанняў будзе друкавацца ў раздзеле каментарыяў. У папярэднім выданні, прынамсі, у асобных тамах, змяшчаліся багатыя звесткі па тэкстуальнай гісторыі. Звыш тысячы вершаваных радкоў прыводзілася ў каментарыях да паэм, вершаваных апавяданняў. Практыка пераконвае, што ў дачыненні да некаторых найбольш значных твораў было б мэтазгодна тэкст першапачатковай рэдакцыі змяшчаць цалкам. Такія спробы рабіліся і ў папярэднім выданні (народныя казкі ў мастацкай апрацоўцы Коласа, асобныя вершы), але недастаткова шырока.

Ды, бадай, самым адказным этапам у рабоце над новым выданнем будзе праца па ўстанаўленню аўтарскага тэксту. Складальнікі, якія рыхтавалі дванаццацітомнік, надзвычай карпатліва ачышчалі тэксты дарэвалюцыйных твораў ад цэнзурных умяшанняў, рэдактарскіх правак і ўсялякіх іншых скажэнняў. Аднак зроблена яшчэ не ўсё. І таму тэкст, абраны за асноўны, як таго і патрабуе тэорыя і практыка падрыхтоўкі навукова-крытычнага выдання, звяраецца з усімі прыжыццёвымі выданнямі і аўтографамі. Папраўкі, якія ўносяцца ў асноўны тэкст, абмяркоўваюцца рэдакцыйнай калегіяй і афармляюцца дакументальна. Дарэчы, папраўкі, якія ўнесены ў тэкст папярэдняга выдання, таксама павінны быць яшчэ раз пракгледжаны з улікам стану сучаснага коласазнаўства.

Многае яшчэ неабходна зрабіць у новым выданні і па ўдакладненню датыроўкі твораў. Тэкстолаг імкнецца даць чытачу максімальна поўнае ўяўленне аб часе напісання твора, а ў адносінах да буйных—устанавіць усе этапы і перыяды аўтарскай працы. Крыніцамі, паводле якіх гэта робіцца, з'яўляюцца не толькі рукапісны тэкст і ўласныя аўтарскія паметкі, але і шматлікія ўскосныя дадзеныя. Гэта вымагае ад складальніка вынаходлівасці, эрудыцыі, даследчыцкай інтуіцыі. Узорнымі ў выданні 1961—1964 гг. можна лічыць каментарыі да паэм «Рыбакова хата», «Адплата» (т. 8), «На шляхах волі» (т. 10). Разам з тым шмат якія творы Я. Коласа датуюцца годам першага з'яўлення ў друку—гэта значыць, датай у значнай ступені ўмоўнай, прыблізнай. Пяцьдзесят дзевяць з сямідзесяці чатырох апавяданняў чакаюць дакладнай датыроўкі.

Значнае месца ў новым выданні займуць, як ужо адзначалася, пісьмы і дзённікі Коласа, яго артыкулы па пытаннях літаратуры і выступленні. Гэтыя матэрыялы дапамогуць паглыбіць і растлумачыць многія моманты творчай біяграфіі народнага паэта. Навуковыя супрацоўнікі, якія рыхтавалі том пісьмаў і публіцыстыкі, маглі б расказаць не пра адну нечаканую знаходку пры расшыфроўцы ініцыялаў, скарачэнняў, пры ўстанаўленні фактаў з жыццёвай і творчай біяграфіі. І ўсё ж тут зроблена далёка не ўсё.

Як бачым, перад калектывам тэкстолагаў стаіць вельмі складаная і адказная задача—даць дасканалае навукова-крытычнае выданне. Будзем спадзявацца, што вырашана яна будзе паспяхова.

Ю. ПШЫРКОЎ,
М. МУШЫНСКІ.

ЭЛЕКСІР БАДЗЁРАСЦІ

Міхасю Скрыпку споўнецца сёння 60 гадоў. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Міхась Аляксандравіч!

Сардэчна віншуем Вас з днём Вашага 60-годдзя.

Шмат год Вы працуеце на ніве нашай літаратуры, з'яўляецеся адным з актыўных працаўнікоў яе сатырычнага цэху. На Вашым творчым рахунку — шматлікія гумарыстычныя вершы і апавяданні, фельетоны і эпіграмы, кароткія камедыі і творы для дзяцей.

Літаратурны занятак Вы доўгі час спалучалі з працай вясковага настаўніка ў школах рэспублікі. Добрае веданне вясковага побыту, жывой гутарковай мовы, багаты педагагічны вопыт станоўча адбіліся на Вашых творах, дапамагаюць Вам у Вашым пошуку дасціпнага, трапнага, сакавітага слова.

Мы ўдзячны Вам за тое, што ў апошні час Вы шмат сіл аддаеце прапагандзе нашай літаратуры, часта і паспяхова выступаеце перад чытачамі.

Жадаем Вам, дарагі Міхась Аляксандравіч, і надалей быць у добрым творчым настроі, па-баявому змагацца зброяй смеху з усім тым, што перашкаджае нашаму руху наперад».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» таксама віншуе юбіляра і жадае яму добрага здароўя і творчых поспехаў.

МІХАСЮ СКРЫПКУ — 60 ГАДОЎ

Мой сябар Міхась Скрыпка любіць ужываць народны афарызм, што паўгадзіны смеху замяняе кілаграм кракаўскай каўбасы!.. І ён сам пацвярджае гэта — папулярны сатырык і гумарыст заўсёды бадзёры, вясёлы, жыццярадасны. А яго жыццё было не лёгкае. Хапіла, як кажуць, і холаду, і голаду...

Нарадзіўся Міхась Скрыпка ў сялянскай сям'і ў вёсцы Месцін на Міншчыне. Ён рана асірацеў. Каб вучыцца — не магло быць і гаворкі. Толькі Савецкая ўлада адкрыла шлях у навуку ўсім абязздоленым і прыніжаным. Міхась Скрыпка ў 1926 годзе канчае Багушэўскую сямігодку, затым у 1930 годзе Рагачоўскі педтэхнікум, працуе настаўнікам і адначасова вучыцца завочна ў Мінскім педагагічным інстытуце на факультэце мовы і літаратуры. Пасля заканчэння інстытута ён працуе выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Трыццаць гадоў, палову жыцця, Міхась Аляксандравіч Скрыпка аддаў высакароднай справе выхавання маладога пакалення.

Пісаць Міхась Скрыпка пачаў вельмі рана, яшчэ ў школьныя гады. Ён быў удзельнікам літаратурнай філіі «Маладняка» пры бабруйскай газеце «Камуніст», якой кіраваў у той час Міхась Ціханавіч Лынькоў. У часе Айчыннай вайны М. Скрыпка партызаніў, затым служыў у Савецкай Арміі. Пасля вайны М. Скрыпка выдае дасціпныя кнігі, вядомыя беларускаму чытачу: «Гумар і сатыра», «Мая хата не з краю», «Усяк бывае», «Пад коранем», «Даіва ў рашаце» і іншыя. Выдаваліся яго кнігі і ў Маскве ў перакладзе на рускую мову.

Міхась Скрыпка — аўтар баек, гумарэсак, кароткіх аднаактовых камедый, апавяданняў, эпіграм. Сярод яго творчых здабыткаў ёсць і аповесці. Піша ён і для дзяцей.

Да 60-годдзя Міхась Скрыпка падрыхтаваў чытачам чарговы падарунак — сёлета выдаў даволі ёмісты зборнік гумару «Сатырычны калаўрот».

Міхась Скрыпка — намеснік старшыні Бюро прапаганды мастацкай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі, шмат выступае перад працоўнымі рэспублікі. І выступленні яго заўсёды карыстаюцца поспехам.

Сваё кароткае слова з юбілейнай нагоды мне хочацца закончыць сяброўскім віншаваннем:

Табе сягоння шасцьдзесят,
І мы цябе віншуем!
Ты дажывеш да сотні, брат,
Мы гэта гарантуем!
Бо смех — найлепшы
элексір
Здароўя, маладосці...

Эдуард ВАЛАСЕВІЧ.

ФАРБЫ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Віталію Цвірко даводзілася пісаць пейзажы розных куткоў нашай краіны—Сярэдняй Азіі і Крыма, Падмаскоўя і Прыбалтыкі. Не расставаўся ён з эцюднікам і ў замежных паездках. Але нідзе не пісалася яму так добра, як на беларускай зямлі. Менавіта родныя краявіды — кранальныя сціплай прыгажосцю, мяккімі спалучэннямі фарбаў — далі мастаку магчымасць выявіць поўна свае пачуцці.

Ён аб'ездзіў усю Беларусь. Яго палітра ўвабрала ў сябе фарбы Міншчыны, Браслаўшчыны, Падняманя, каларыт Прыпяцкага краю. З поўнай душэўнай самаддачай піша ён палескія краявіды, маляўнічыя куткі Лагойшчыны, славутую Бярозу і безыменныя рачулкі, лясныя прасекі, млыны, рыбацкія прычалы. Пры гэтым свежасць пачуцця, вастрыня зроку, душэўная прыўзнятасць прымушаюць нас нанова перажываць адкрыццё добра для ўсіх нас знаёмага.

Кожная сустрэча з творчасцю майстра прыносіць радасць. Радаснай будзе і сустрэча з каляровымі рэпрадукцыямі дваццаці пяці пейзажаў Віталія Цвірко, выдадзенымі нядаўна ў Маскве «Советским художником».

У альбоме — раннія работы мастака, такія, як «Вячэрні матыў» (1946), «Сакавік. Халодны дзень» (1947), «Ля млына» (1954), творы апошніх гадоў: шырока вядомыя «На возеры Свір» (1962), «Неман» (1964), «Сказ пра Палессе» (1964—1965), «Браслаў» (1965). Паспелі палюбіцца гледачу і зусім нядаўна створаныя мастаком пейзажы «Мазыр», «Прыпяць», «Беларускі матыў», напісаныя ў 1966 годзе. На вокладку вынесены пейзаж 1963 года «Восень».

Альбом суправаджаецца артыкулам М. Арловай пра творчасць Віталія Цвірко—пейзажыста. Крытык слушна зазначае: «...улюбёнасць мастака ў свой край і ў мастацтва дапамагла яму сказаць... нешта новае.., хвалюючае і натхняючае».

З гэтым пагодзіцца кожны, хто пазнаёміцца з альбомам.

Віталій Цвірко. Пейзажы. «Советский художник». Масква. 1967. Тыраж 9800 экз. Цана 1 руб. 48 к.

Ул. БОЙКА.

У МАСКОЎСКІМ ШТОГОДНІКУ

У выдавецтве «Дзіцячая літаратура» выйшаў чарговы штогоднік, прысвечаны пытанням дзіцячай літаратуры. У раздзеле «У братніх рэспубліках» змешчаны артыкул Э. Агняцвет «Паэзія для дзяцей, яе эмоцыі і фарбы», прысвечаны сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей.

ЧАСОПІСЫ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

Па-святочнаму афармленыя і багата ілюстраваныя лістападаўскія нумары нашых часопісаў. Яны прысвечаны слаўнаму юбілею — 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Вось што прапануюць чытачам часопісы:

«ПОЛЫМЯ» Лістападаўскі нумар асабліва багаты на паэзію — чытачы знойдуць у ім падборкі вершаў П. Броўкі, С. Гаўрусёва, М. Танка, вершы Э. Агняцвет, С. Шушкевіча, М. Хведаровіча, А. Бялевіча, Х. Жычкі, М. Шаховіча, К. Кірэенкі.

Часопіс працягвае друкаваць дакументальную аповесць І. Новікава «Тварам да небяспекі». Проза прадстаўлена таксама апавяданнямі А. Асіпенкі і Я. Васілёнка.

У раздзеле перакладаў пад назвай «Апавяданні нашых сяброў» надрукаваны творы А. Ганчара, М. Стальмаха, М. Аўэзава, А. Упіта, Ч. Айтматава, А. Сулакауры, Г. Беса, І. Друцэ.

Публіцыстычныя артыкулы Ц. Кісялёва, І. Ігнаценкі, В. Купрэвіча, Я. Рапановіча прысвечаны пяцідзесяцігоддзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У раздзеле крытыкі і літаратуразнаўства — артыкулы В. Каваленкі — пра трылогію Я. Коласа «На ростанях», С. Александровіча — да 60-годдзя з дня нараджэння Ц. Гартнага, І. Навуменкі — да 60-годдзя з дня нараджэння М. Ларчанкі. У нумары змешчаны таксама рэцэнзіі А. Вярцінскага — на «Дзень паэзіі 1967» і П. Вярова — на бібліяграфічны даведнік «Беларускае мовазнаўства», а таксама «Старонкі беларускай энцыклапедыі» і «Хроніка».

«МАЛАДОСЦЬ» Часопіс адкрываецца публіцыстычнай паэмай С. Гаўрусёва «Профіль веку». Паэзія прадстаўлена ў нумары таксама творамі У. Ляпёшкіна, В. Лукшы, У. Нядзведскага. Да 80-годдзя з дня нараджэння Цішкі Гартнага друкуецца яго верш «Вечнае».

Часопіс дае заканчэнне аповесці С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка».

«Векапомнае» — такой агульнай назвай аб'яднаны ўспаміны ўдзельніка Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі П. Іванова, У. Саўчука, К. Бакуновіча, І. Горскага, П. Голуба, В. Дударава.

У нумары чытачы знойдуць таксама публіцыстычныя матэрыялы В. Жданоўіча, Б. Крэпака, А. Дзітлава, Г. Айзенштат, рэцэнзію С. Гусака на двухтомную «Анталогію беларускага апавядання», сатырычныя мініяцюры М. Скрыпкі.

«БЕЛАРУСЬ» Святочная паэма К. Шавеля, вершы У. Паўлава, Э. Агняцвет, П. Прыходзькі, аўстралійскага паэта Джэфры Датана (перакладаў Я. Семяжон) — паэзія лістападаўскага нумара.

Проза прадстаўлена апавяданнямі Р. Сабалені «Грэх на душы» і В. Рудавай «Цішыня».

Як заўсёды, у часопісе багата публіцыстычных матэрыялаў. Пад рубрыкай «Народжаныя пад сцягам Кастрычніка» друкуецца рэпартаж В. Паўлічэнкі «Дары наваполацкіх хімікаў». «Дзень першы і дзень 18200-ты»—так называецца артыкул І. Яцкевіча і Я. Садоўскага пра два дні Мінска. Пісьменнік І. Гурскі расказвае ў часопісе пра арганізацыю рэвалюцыйнага палка імя Мінскага Савета. Нарыс З. Прыгодзіча «Дарогай камунараў» прысвечаны жыццю і справам саўгаса «Цімакава» Клімавіцкага раёна.

Творчы партрэт народнага артыста СССР П. Малчанава «Рэвалюцыяй прызваны» напісаны У. Няфёдам.

«НЁМАН» Святочны нумар часопіса адкрываецца вянком санетаў А. Сакалова «Кастрычнік семнаццатага года». Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка надрукаваны хроніка падзей 1917 года, успаміны Г. Салаўёва, В. Краснаўскага, падборка «Мы помнім іх імёны».

Проза прадстаўлена дакументальнай аповесцю С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка» (пераклад з беларускай мовы Ю. Канэ). У раздзеле паэзіі змешчаны верш Ул. Аляхновіча «Ля Сцяны Камунараў».

Надрукаваны таксама нарысы Ул. Варно «З Леніным у сэрцы», А. Шлега — «Шлях жыцця», артыкул Ніны Дарафеенкі «Віцебск ў агні».

Крытыку складаюць артыкулы М. Танка «Покліч часу» і Т. Дзмітрыевай аб кнізе У. І. Леніна «Аб Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі», рэцэнзіі Б. Мядзведзева — на кнігу «Эканоміка Беларускай ССР ў будаўніцтве сацыялізма», А. Коласава — на кнігу «Родная наша ўлада».

У раздзеле «Знойдзена ў архівах» змешчан артыкул Б. Клейна «Яны не прасілі аб памілаванні».

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Андрэй Александровіч. Месяц сеў на хмарку. Вершы. Мастак Р. Кудрэвіч. На рускай мове. 1967 г. Тыраж 150.000 экз. 48 стар. Цана 18 кап.

Вісарыён Гарбук. Твар у палоску. Апавяданні. Мастак Е. Лось. На рускай мове. 1967 г. Тыраж 50.000 экз. 152 стар.

Дзень паэзіі. 1967. Зборнік. Мастак Б. Забораў. Сяброўскія шаржы М. Лісоўскага. Тыраж 8.000 экз. 194 стар. Цана 95 кап.

І. Ігнаценка, У. Івашын. Кастрычнік у Беларусі. Мастак В. Шаранговіч. 1967 г. Тыраж 8.000 экз. 224 стар. Цана 46 кап.

Літаратурны музей Якуба Коласа. Альбом. Тэкст і складанне М. Вазарэвіча і І. Курбекі. Афармленне В. Філімонава. У альбоме выкарыстаны здымкі з фондаў Літаратурнага музея Якуба Коласа. 1967 г. Тыраж 19.000 экз. Цана 32 кап.

Піліп Пестрак. Сустрэнемся на барыкадах. Раман. Кніга першая. Аўтарызаваны пераклад з беларускай мовы П. Кабзарэўскага. Мастак П. Калінін. 1967 г. Тыраж 80.000 экз. 420 стар. Цана 84 кап.

Піліп Пестрак. Сустрэнемся на барыкадах. Раман. Кніга другая. На рускай мове. 1967 г. Тыраж 80.000 экз. 528 стар. Цана 1 руб. 02 кап.

Максім Танк. Збор твораў у чатырох тамах. Том чацвёрты. Перапіска з зямлёй. Лісткі календара. Шляхамі дружбы. Мастак Б. Забораў. 1967 г. Тыраж 8.000 экз. 700 стар. Цана 1 руб. 11 кап.

Хрыстафор Прыбыль. У пошук ідзе разведка. Мастак П. Аляксееў. На рускай мове. 1967 г. Тыраж 50.000 экз. 212 стар. Цана 47 кап.

Тарас Хадкевіч. Жылабыла казка. Апавяданні. Мастак У. Сініцці. 1967 г. Тыраж 15.000 экз. 120 стар. Цана 29 кап.

Хоры акапэла. Мастацкай самадзейнасці. 1967 г. Тыраж 5.000 экз. 48 стар. Цана 30 кап.

Р. Храмовіч. Тры партызанскія гады. Запіскі сакратара падпольнага райкома КП Беларусі. Літаратурная апрацоўка І. Бурсава. Мастак В. Дзяменцьеў. На рускай мове. 1967 г. Тыраж 50.000 экз. 240 стар. Цана 58 кап.

ЯНЫ АФАРМЛЯЮЦЬ НАШЫ КНІГІ

ГУСТ, ЛАКАНІЗМ, ЦЭЛЬНАСЦЬ

ІМЯ ЛЕАНІДА ПРАГІНА надзвычай рэдка сустрэнеш у аглядах мастацкіх выставак, у рэцэнзіях на кніжкі выдавецтва «Беларусь», дзе ён больш дваццаці гадоў працуе мастацкім рэдактарам. Не сустракалася ў нашай перыёдыцы і яго «творчая лабараторыя». А між тым у свет рэгулярна выходзяць кнігі, у выхадных дадзеных якіх значыцца: «мастацкі рэдактар—Л. Прагін». І часта ён — не толькі мастацкі рэдактар, але і мастак, аўтар афармлення. Для яго кніга—цэласны мастацкі арганізм, і ён, як рэжысёр, спалучае ўсе яе элементы ў дакладнае стылявое адзінства — ад шрыфту і дэкору да фармату выдання, гатунку паперы. Неад'емныя якасці Л. Прагіна як канструктара кнігі — мастацкі такт, лаканізм графічных сродкаў, добрае веданне нашай паліграфіі, высокі густ.

— Пошукі цэльнасці выдання, — расказвае Л. Прагін, — пачынаюцца, як толькі пазнаёмішся з рукапісам. Распрацоўваеш у праекце ўсе элементы кнігі — вокладку, тытульны ліст, пачатковыя, радавыя і канцавыя палосы, падпарадкоўваеш усё пэўнай думцы, пэўнаму ладу. Тут усё мае значэнне — дробязей няма...

Так, сапраўды, знаёмячыся з кнігамі, сканструяванымі Л. Прагіным, пераконваешся, што для яго дробязей не існуе. Мастацкі эфект дасягаецца адзінствам формы і зместу.

— У кнізе павінен быць пэўны рух,—кажа Л. Прагін, — які мусіць весці чытача па кнізе. Ён дасягаецца з дапамогай вёрсткі, графікі, колеру. Гэта арганізуе памяць чытача, звязвае адны старонкі з другімі.

Л. Прагін заўсёды актыўна шукае графічны ключ да мастацкага вобраза выдання. Вось, напрыклад, кніга «Бальшавіцкая газета «Правда» ў Беларусі». Тут складаная вобразная задача выканана апасродкавана — з дапамогай шрыфту, кампазіцыйнай пабудовы, колеру. Элементы афармлення звязаны арганічна і адпавядаюць задуме — перадаць патрыятычны пафас. Невыпадкова на Усесаюзным конкурсе на лепшыя па мастацкаму афармленню і паліграфічнаму выкананню кнігі якраз за гэтае выданне Л. Прагіну быў уручаны дыплом.

Гэтак жа арганічна пабудавана і кніга «Чалавек працаю слаўны». Тут асноўны прыём выразнасці—форма шрыфту і арнамент, якія ўдала вар'іруюцца на суперы, тытуле, пачатковых палосах. Афармленне гэтай кнігі таксама атрымала прызнанне на Усесаюзным конкурсе.

Л. Прагін заўсёды імкнецца падкрэсліць выяўленчымі сродкамі ідэйнае, эмацыянальнае гучанне кнігі. Аднолькава патрабавальны мастак у афармленні і мастацкай, і палітычнай, і сельскагаспадарчай літаратуры. Старанна і ўдумліва афармлены ім «Дзень паэзіі 1966», «Падрыхтоўка цяжкапрарастаючага насення да пасеву» А. Саўчанкі, «Гектар пашы» В. Сцепанкі і А. Карлоўскай.

Знаёмячыся са шматлікімі выданнямі, афармленымі Л. Прагіным, асабліва з такімі, як зборы твораў Я. Коласа, К. Чорнага, А. Куляшова, «Анталогія літоўскай літаратуры» і іншыя, бачыш, як тонка мастак умее перадаць нацыянальны каларыт кнігі.

Поспех даецца нялёгка. Настойлівыя пошукі, глыбокі роздум прыносяць такія ўдачы, як, напрыклад, афармленне зборніка «Вянок дружбы», дзе знаходкі падмацаваны і кампазіцыйна, і колеравым вырашэннем. На жаль, пры друку супервокладка аказалася не ва ўсім адпаведнай эскізу, які больш мяккі і пяшчотны па колеру.

Л. Прагін шмат увагі і часу аддае і распрацоўцы «свайго шрыфту» — хоча стварыць новы. У мастака ёсць мара — набраць новаствораным шрыфтам кнігу вершаў.

Мастацтва Л. Прагіна — кніжнага графіка і мастацкага рэдактара — радуе высакароднай прастатой і глыбокай змястоўнасцю. Яго кнігі неаднойчы адзначаліся на розных выстаўках дыпломамі, медалямі, прэміямі. Сярод іх такія выданні апошніх гадоў, як анталогія балгарскай паэзіі «Ад стром Балканскіх», «Кацярына» Т. Шаўчэнкі, «Выбраныя творы» Ул. Дубоўкі, у якіх ён з'яўляўся мастацкім рэдактарам.

Творчасць Л. Прагіна — прыкметны ўклад у развіццё беларускай кніжнай графікі.

Вольга ЦЕРАШЧАТАВА.

ЧЫРВОНЫЯ КАМЕНЬЧЫКІ

БАРЫС КАЗАНАЎ

Апавяданне

Яшку адно чатырнаццаць гадоў, а ён ужо інвалід — калека: мінай адарвала правую руку вышэй локця і знявечыла твар. Здарылася гэта летась — праз дваццаць гадоў пасля вайны. Яшка ў той дзень хадзіў з маці ў грыбы. На міну яны найшлі, як пераходзілі балота, за якім быў паром. Наступіў на міну Яшка... Маці забіла адразу. Яна нават не паспела нічога сказаць сыну напаследак.

Цяпер Яшка касір на лодачнай станцыі: выдае білеты з блакітным якарам, уключыны і вёслы. Лодак на гэтай станцыі ажно дзесяць. Сёння іх пазабіралі з самае раніцы, на ўвесь дзень, і ў Яшкі багата вольнага часу. Ён сядзіць у службовым пакоі. Тут халаднавата нават у самую спёку. Яшка сядзіць за сталом пад вялікім плакатам, які заклікае адпачываючых карыстацца Яшкавымі паслугамі, і чытае зашмуленую, без вокладкі кніжку, якую прынёс нехта сюды і забыў. Кніжка называецца «Руководство по уходу и эксплуатации спортивных велосипедов». Але чытае Яшка яе ўважліва і кожную старонку падоўгу трымае, быццам не адважваецца перагарнуць. Час ад часу ён задзірае галаву, каб паглядзець у акно: там цячэ Днепр, на ім відаць баржы, драўляны мост, што злучае абодва берагі; за мастом узвышаюцца гарадскія дамы і заводскія трубы.

У дзверы каторы раз нехта стукае. Чуецца дзіцячы голас:

— Адчыні, дзядзя!

Яшка адказвае з-за стала:

— Лодак няма... і сёння не будзе!

Але шоргат не заціхае. Нехта спрабуе дацягнуцца да клямкі. Нарэшце дзверы адчыняюцца, і ў пакой заходзіць дзяўчынка. Яна ўся загарэлая, ажно чорная ад сонца, нібыта выскачыла, як чарцяня, з коміна.

— Добры дзень, дзядзя!

— Дзень добры, — пагардліва ўсміхаецца Яшка. — Я ваша цёця.

— А ты і не цёця і не дзядзя, — раптам кажа дзяўчына. — Ты хлопчык. Я адразу здагадалася.

— А што яшчэ? — Не перастае ўсміхацца Яшка.

— Завядзі мяне да мамы. Я згубілася. — Яна таксама пачынае ўсміхацца.

— Дзе ж твая маці?

— Пайшла піць ліманад.

— Ого! — Яшка ажно хмурыць лоб. — Далёка ж ты зайшла...

— А ўчора дык яшчэ далей заходзіла,— прызнаецца, як узрадаваная, дзяўчынка. — Мяне толькі на месце злавілі і адвялі назад.

— Цябе, мусіць, і зараз шукаюць.—Яшка нейкі час думае. — Але што рабіць з табой. І тады дзяўчынка пытае:

— А што, сёння Новы год?

— Чаму Новы год? — паціскае плячамі здзіўлена Яшка. — Улётку не бывае Новага года, — кажа ён голасам старэйшага.

— Тады чаму ты страшны такі?

Яшка чырванее, пачынае хваляванца:

— Дзе твая мама? Куды цябе весці?

Ён зачыняе дзверы на замок і вешае на іх паперку: «Буду заняты па грамадскай справе. Лодачнік Мухін Якаў».

На пляжы — гоман: народу—няма дзе яблыку ўпасці. Яшка вядзе незнаёмую дзяўчынку паўз дэбаркадар, марскі клуб. Горача. У адчыненых сенцах марскога клуба лётаюць жоўтыя восы.

Прыціхшая дзяўчынка зноў нечакана пытае:

— А ў цябе мама ёсць?

— Была.

— Яна памёрла?

Яшка насцярожваецца:

— Адкуль ты ведаеш?

— Мамы часта паміраюць... У Нінкі Капусцінай яшчэ сёлета памёрла мама. — Дзяўчынка ідзе колькі часу, тады зноў пытае: — І ты паміраў?

— Паміраў, але, бачыш,—не памёр.

— Я так і падумала, бо ты на Кашчэя Бяссмертнага падобны. — Дзяўчынка спыняецца і доўга глядзіць на знявечаны Яшкаў твар.

Гэтая бесцырымоннасць выводзіць Яшку з раўнавагі, і ён пачынае злавацца:

— Што табе трэба?

— А ты і праўда, як Бяссмертны Кашчэй, — ужо з нейкай радасцю крычыць дзяўчынка; яна смяецца і падскоквае на гарачым пяску.

— Хадзем! — Яшка тузае дзяўчынку за руку.

— А ты дастанеш мне чырвоных каменьчыкаў з ракі? Я сёння бачыла іх на дне.

— Дастану, — моршчыцца ад нездаволенасці Яшка. — Можа ты і на веласіпедзе хочаш пакатацца?

— На якім?

— На гоначным.

— А гэта які?

—Шаўляйскі, В-82, — тлумачыць Яшка.

— Не, на гоначным я не ўмею, — уздыхае дзяўчынка. — А ты сам умееш?

Яшка чырванее, быццам дзяўчынка раптам на нечым яго злавіла.

Каля тачкі з газіраванай вадой яны спыняюцца. І тут шмат людзей. Дзяўчынка просіцца Яшку на плечы.

— Добра, шукай сваю маму, — згаджаецца Яшка.

Дзяўчынка абдымае Яшку за шыю, акідвае вачанятамі натоўп. «А яна зусім не баіцца мяне», — думае тым часам Яшка.

— А чаму вунь тая цёця футбольныя трусы надзела? — крычыць Яшку на вуха дзяўчынка. — Ці ж цёці гуляюць у футбол?

Яшку не відаць «цёці ў футбольных трусах» і ён ссаджвае дзяўчынку на зямлю.

Але дзяўчынкіна маці знаходзіць іх сама.

— Мама, гэта Кашчэй Бяссмертны, — кажа шчаслівым галаском дзяўчынка, і паказвае на Яшку. — А рука ў яго зноў вырасце, вось пабачыш!

— Як табе не сорамна, — пачынае ўшчуваць маці сваю няўрымслівую дачку—жанчыне непрыемна, што тая гэтак гаворыць пра хлопчыка-калеку.

—А каменьчыкі прынясеш? — ужо на хаду пытае дзяўчынка.

— Добра, — махае рукой Яшка.

Ад марскога клуба адзін за адным адплываюць ялы з маленькімі сцяжкамі ДАСААФа на карме.

— Толік! — кліча Яшка.

Толік — старшына таго яла, што не паспеў адплысці. Старшына нагінаецца цераз борт, хапаецца за бервяно і выскоквае на прычал.

— Здароў, — кажа Толік.

Яшка падае старшыну руку. Ён не глядзіць на шлюпку: паспеў да гэтага кінуць вокам, каб пераканацца. Там парадак: рангоўт і ветразі ўкладзены як след, весляры сядзяць кожны на сваім месцы — адна рука на дзержаку вясла, другая прасунута пад валёк. Хлопцы сядзяць на банках і нібыта не заўважаюць, што іхні камандзір стаіць на прычале з Яшкам. Такія паводзіны весляроў падабаюцца Яшку. «Малайчына, Толік»,—думае Яшка, спрабуючы не зайздросціць: Толіка прызначылі старшыной яла пасля Яшкі. І Яшку цяпер здаецца, што справы ў "овага камандзіра ідуць куды лепей.

— Хутка спаборніцтвы?

— Хутка, — ківае галавой Толік.

— Цяпер Сцяпанаў не дасць перадыхнуць, — працягвае Яшка. — Гэта праўда, — быццам нявесела ўсміхаецца Толік. — Сцяпанаў ва ўключыну ўстаўляць не ўмееце!»

— Сцяпанаў — звер! — з захапленнем кажа Яшка.

— Ён неяк успамінаў пра цябе. Кажа: «Мухін быў добры вясляр».

— Значыць, у паход ідзеце... — быццам не чуе Толікавых слоў Яшка:

— А ў цябе што? — Толік пачынае церці лоб: ён не ведае, аб чым гаварыць з Яшкам.

— Ды вось... дзяўчынку адну адвёў да маці. Згубілася, дык трэба было памагчы людзям,

— Добра, заскочым неяк да цябе пакатацца, каб без усялякіх там гонак, без секундамера, а проста так, для душы, — абяцае на развітанне Толік, але Яшка не верыць: Толік ужо не першы раз гаворыць гэтак.

На ганку лодачнай станцыі — вялікі натоўп людзей: — усім патрэбны Яшкавы лодкі. Але Яшка праходзіць у свой службовы пакой моўчкі. Ён зноў пачынае чытаць кніжку.

— Таварыш Якаў Мухін, — звяртаецца да яго нейкі таўсманы дзядзька, — ці нельга ў вас атрымаць лодачку? Адну, усяго адну.

— Лодак сёння не будзе!

Нарэшце надыходзіць вечар. Яшка апошні раз аглядае лодкі і нясе выручку бухгалтару на дэбарнадар. Бухгалтар выпісвае Яшку квітанцыю, але не спяшаецца адпускаць яго. Яшка сядзіць насупроць бухгалтара, тузае свой пусты рукаў, і ўсё паглядвае на гадзіннік. Бухгалтар тым часам шчоўкае пальцамі на лічыльніку, быццам іграе на якім музычным інструменце. Пасля гаворыць:

— Мухін, табе пенсію прыслалі. Бяры.

Яшка нейкі час глядзіць на зялёныя трохрублёўкі, быццам штосьці абдумвае. Нарэшце ківае галавой:

— Якраз хопіць!

— Гаспадар павінен сам ведаць, — паціскае плячыма бухгалтар.

Але Яшка не адказвае, выходзіць на ганак. На дэбаркадары сядзяць і курацъ капітаны самаходных барж. У паветры таўкуць мак камары. А на Дняпры — пуста.

Яшка ідзе да маста. Па другі бок яго — гарадскі парк. Там ужо бухкаюць духавыя трубы. Але Яшка наварочвае да драўлянага павільёнчыка, што прыткнуўся бакавой сцяной да трансфарматарнай будкі. На павільёнчыку свецяцца літары — пнеўматычны цір.

У піры яшчэ наведвальнікаў няма. Загадчык ціра дзядзя Валянцін гуляе сам з сабою ў шашкі. У яго няголены і нібыта абвуглены твар; на ім — афіцэрскі фрэнч з медалямі і шыр

М. ЧЭПІК. 1941 (масла).

ВЫСОКАЕ ПРЫЗНАННЕ НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

у рэжысёрскім вырашэнні, акцёрскіх трактоўках, незвычайна яркай аператарскай рабоце найскладанейшую тэму пераадолення трагізму ў гісторыі, сцвярджэння каштоўнасці жыцця, заваяванага крывёю. Падзеі фільма пераступаюць пэўныя межы, яны выходзяць за ваколіцу маленькага літоўскага сяла і даходзяць да сэрца тых, хто задумваецца над праблемамі дабра і зла, хто пастаянна памятае аб адказнасці кожнага за дзень учарашні, сённяшні, заўтрашні.

У спісе лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР юбілейнага года — рад вядомых дзеячоў савецкай музычнай культуры.

Кампазітар Андрэй Пятроў удастоены прэміі за песні 1964—1965 гадоў. Творчасць гэтага таленавітага майстра — арганічны сплаў нацыянальных рускіх інтанацый, савецкай масавай песні і сучасных рытмаў. Менавіта светлае жыццялюбства, бадзёры, прыўзняты тонус, натуральнасць меладычнага пачатку і яркасць нацыянальных вытокаў забяспечылі поспех такіх песень Пятрова, як «На кургане», «Блакітныя гарады», «Я крочу па Маскве», «Песня пра сябра» і «Песня пра майго бацьку».

Шырокую папулярнасць атрымала творчасць кампазітара Ціхана Хрэннікава. Яго оперы («У бури», «Маці», «Бязродны зяць»), сімфоніі, песні карыстаюцца заслужаным поспехам у слухачоў. Яго канцэрты для скрыпкі з аркестрам і для віяланчэлі з аркестрам, адзначаныя прэміяй,— гэта арыгінальныя, выразныя, тэмпераментныя сімфанічныя п'есы, якія вельмі непасрэдна і ярка ўвасабляюць свет адкрытых і светлых эмоцый нашага сучасніка. Лаканізм і прастата выкладання спалучаюцца з прыгажосцю аддзелкі дэталяў і празрыстай «акварэльнай» маляўнічасцю гучання.

Араторыя Атара Тактакішвілі «Па слядах Руставелі», таксама удастоеная прэміі, узнаўляе вобраз геніяльнага нацыянальнага паэта Грузіі. Аднак думка і пачуццё кампазітара напоўнены адчуваннем сённяшняга дня. Эпічна непаспешлівая, узнёсла-прасветленая музыка гэтых «хвалебных песнапенняў» узнімаецца да пранікнёнай оды Радзіме, светлага гімна любві да айчыны, да роднай зямлі, роднага народа, яго духоўных тварэнняў, гісторыі, мовы. Дзякуючы арганічнай, блізкай сувязі з грузінскім музычным фальклорам і творчаму асэнсаванню традыцый сусветнага мастацтва, араторыя Тактакішвілі «Па слядах Руставелі» ўспрымаецца як з'ява глыбока характэрная для многанацыянальнай савецкай сацыялістычнай культуры.

Гаворачы аб творчым абліччы яшчэ аднаго лаўрэата — мастацкага кіраўніка Рэспубліканскай акадэмічнай рускай харавой капэлы Аляксандра Юрлова, трэба адразу адзначыць яго выключны энтузіязм літаральна ва ўсім, што датычыцца харавога мастацтва. Другая характэрная рыса гэтага музыканта — рэдкая шырыня яго выканаўчых інтарэсаў, размах творчай дзейнасці. Цяжка назваць якую-небудзь прэм'еру харавога твора за апошнія гады, якая прайшла б без удзелу капэлы пад кіраўніцтвам Юрлова. Цэнтральнае месца ў абшырным рэпертуары капэлы займаюць новыя творы савецкіх кампазітараў. А. Юрлоў выступае таксама як актыўны прапагандыст малавядомых харавых твораў сусветнай класікі і айчыннай музычнай культуры. Асабліва ўзноўленыя ім творы майстроў рускага старадаўняга многагалосся (Бартнянскага, Беразоўскага, Ведэля і іншых) адкрылі савецкім і зарубежным аматарам харавога мастацтва цэлы пласт незаслужана забытай нацыянальнай культуры. Усё гэта разам узятае зрабіла выступленні выдатнага калектыву ўпрыгожаннем нашага канцэртнага жыцця і вылучыла Аляксандра Юрлова ў рад найбольш яркіх прадстаўнікоў савецкай харавой школы.

Прэміі прысуджаны тром выдатным майстрам выяўленчага мастацтва — скульптару Кацярыне Белашовай, жывапісцу Ізату Клычаву і графіку Віталію Гараеву.

Творчасць Белашовай раскрывае багацце духоўнага свету чалавека. Яе адрозніваюць пранікнёнасць псіхалагічных характарыстык, глыбокая змястоўнасць вобразаў. У партрэце «Надзежда Канстанцінаўна Крупская» перададзена бясстрашша рэвалюцыянеркі і паэтычнасць яе натуры. Скульптура «Летуценне» — вобраз маладой сялянкі, поўны лірычнага цяпла і жыццёвай праўды. Незвычайны кампазіцыйны разварот у партрэце Пушкіна перадае ўнутраную свабоду агорнутага глыбокай думай паэта. Творчасць Белашовай вельмі нацыянальная, паводле слоў Сяргея Канёнкава, «гэта чыста рускі талент... Створаныя ёю вобразы народжаны ўсім укладам нашага жыцця».

Лад жыцця роднай краіны ярка адбіўся і ў серыі карцін Ізата Клычава «Мая Туркменія». Яны як быццам асветлены пякучым сярэднеазіяцкім сонцам — такія чыстыя іх фарбы. Каляровая і лінейная кампазіцыі яго палотнаў вельмі музычныя, яны прысякнуты напеўным рытмам. Выдатны жывапісец, Клычаў у сваіх карцінах расказвае аб людзях Савецкай Туркменіі, аб іх творчай таленавітасці, аб багацці іх духоўнага жыцця.

Цікава, што да рэвалюцыі туркмены не мелі свайго станковага выяўленчага мастацтва. Вялікі Кастрычнік далучыў іх да скарбніцы культуры іншых народаў Савецкай краіны. Вучань выдатнага мастака Барыса Іягансона Ізат Клычаў своеасабліва спалучыў у сваёй творчасці прынцыпы рускай рэалістычнай школы з уласцівым туркменам дарам дэкаратыўна-каларыстычнага адчування і рытмічнага багацця, якое ідзе ад шматвекавой традыцыі народнай творчасці. У асобе Ізата Клычава туркменскі народ набыў самабытнага мастака, які стаў у рад лепшых майстроў усяго савецкага мастацтва.

Віталій Гараеў вельмі па-новаму праілюстраваў «Пецярбургскія аповесці» М. В. Гогаля. У вострых і артыстычных малюнках выразна паказаны змрочны гогалеўскі Пецярбург, перададзена ўнутранае напружанне, глыбокі драматызм аповесцей. У сваіх малюнках мастак вельмі самастойны, яны зусім не нагадваюць работ ранейшых ілюстратараў вялікага сатырыка і разам з тым вельмі блізкія да характару гогалеўскага тэксту. Рад партрэтаў пісьменніка, якія адкрываюць кнігу і заключаюць кожную з аповесцей, робіць яго як бы галоўным іх героем. Новыя ілюстрацыі Гараева—не толькі этапная работа яго творчасці, але і вялікая падзея ў жыцці савецкай графікі.

У галіне архітэктуры ўзнагароджаны архітэктары А. Палянскі, Д. Вітухін, інжынер Ю. Рацкевіч— аўтары міжнароднага піянерскага лагера «Прыбярэжны» ў Артэку і архітэктары А. Мілецкі, Э. Більскі, інжынеры А. Печанаў, Л. Ліновіч—стваральнікі Кіеўскага Палаца піянераў і школьнікаў.

Лагер «Прыбярэжны» ўяўляе сабой частку вялікага комплексу Новага Артэка. Аўтарам гэтага комплексу ўдалося пераканаўча даказаць, што індустрыялізацыя і уніфікацыя будаўніцтва не з'яўляюцца перашкодай для стварэння сапраўды мастацкага твора архітэктуры. З некалькіх тыповых элементаў сабраны лёгкія і сучасныя па сваім абліччы разнастайныя збудаванні комплексу. У іх арганічна спалучаюцца прыгажосць і зручнасць, арыгінальнасць канструкцыі і эканамічнасць. Ансамбль піянерскага лагера выдатна ўпісаўся ў маляўнічую прыроду Чарнаморскага ўзбярэжжа Крыма, заваяваў шырокае прызнанне і вядомасць.

Новы комплекс Кіеўскага Палаца піянераў і школьнікаў размясціўся на высокім зялёным правым беразе Дняпра. Своеасаблівая архітэктурна-прасторавая кампазіцыя, якая дазволіла правільна вырашыць задачы рознабаковага функцыянальнага прызначэння збудавання, ужыванне сучасных матэрыялаў, сінтэз архітэктуры і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва характэрны для гэтага сапраўды мастацкага твора сучаснага савецкага дойлідства.

Абедзве работы савецкіх архітэктараў адрасаваны дзецям — будучым будаўнікам новага грамадства. Яны, несумненна, садзейнічаюць фарміраванню эстэтычнага густу падрастаючага пакалення савецкіх грамадзян.

Усе ўдастоеныя высокай узнагароды творы, натуральна, адрозніваюцца адзін ад аднаго, усе іх аўтары — мастакі непаўторнай індывідуальнасці. Але ёсць тое, што ўсіх іх аб'ядноўвае, — глыбокая жыццёвая праўда, высокая ідэйнасць і гуманізм. Святлом Кастрычніка, святлом камуністычных ідэалаў азорана іх жыццесцвярджальнае мастацтва.

(АДН).

Помнікі нашага краю

ЖЫЛЫ ДОМ У НЯСВІЖЫ

Грамадзянскіх будынкаў у спісе помнікаў архітэктуры — адзінкі. Сярод іх — мураваны жылы дом рамесніка або купца ў Нясвіжы («Дом на рынку», як яго часта называюць). Пабудаваны ён у 1721 годзе.

Дом стаіць на цэнтральнай плошчы горада па суседству з будынкам былой ратушы і гандлёвымі радамі. Калісь гэтае месца, забудаванае па перыметру дамамі з крамамі і рамесніцкімі майстэрнямі, было самым ажыўленым. «Дом на рынку» належыць да аднаго з варыянтаў гарадскога жылля XVIII стагоддзя. Для яго характэрны кампактны аб'ём, двухскатны дах і фігурны фасад.

План дома цяпер цяжка вызначыць з-за пазнейшых карэнных перабудоў. Можна толькі меркаваць, што дом падзяляўся на жыллёвую і гаспадарчую часткі. Гаспадарчая знаходзілася на першым паверсе, дзе было некалькі крам або майстэрань. Другі паверх адводзілі пад жыллё. Туды вёў асобны ўваход. Тут шмат пакойчыкаў. Магчыма частку пакояў здавалі ў наём.

Найбольш цікавая ў архітэктуры «Дома на рынку» галоўная фасадная сцяна, за высокім фігурным контурам якой хаваецца дах.

Агульныя абрысы гэтай сцяны адпавядаюць архітэктурнаму стылю першай палавіны XVIII стагоддзя. Пры ўважлівым аглядзе фасада можна заўважыць некаторую асіметрыю размяшчэння аконных і дзвярных праёмаў. Увогуле ж будаўнік дома імкнуўся стварыць сіметрычную кампазіцыю, але планіроўка рабочай палавіны, звязаная з тэхналогіяй вытворчасці, відаць, перашкодзіла гэтаму.

«Дом на рынку» ў Нясвіжы — адзін з самых ранніх вядомых жылых будынкаў Беларусі. Мураваныя жылыя дамы з майстэрнямі рамеснікаў і крамамі гандляроў, якія ёсць у Навагрудку, Слоніме, Ружанах і іншых гарадах Беларусі, адносяцца да больш позняга перыяду, пераважна да канца XVIII—першай палавіны XIX стагоддзя. Але нягледзячы на розны час будаўніцтва, яны падобныя адзін да аднаго.

Пры агульнай планіровачнай структуры і блізкай кампазіцыі фасадаў дамы адрозніваюцца аздабленнем франтонных сцен. Тут можна сустрэць матывы і барока, і класіцызму, змяшанне гэтых стыляў і наогул вольную трактоўку дэталей. Мясцовыя майстры хоць і пераймалі ўзоры тагачаснай манументальнай архітэктуры, але шырока карысталіся і традыцыйнымі прыёмамі народнага дойлідства. У сваёй рабоце яны заўсёды кіраваліся эканамічнай і функцыянальнай мэтазгоднасцю будынка.

В. ЧАНТУРЫЯ,
доктар архітэктуры.

ПЕСНЮ НЕ СКАРЫЦЬ!

МІКІС ТЭАДАРАКІС... ПРА ЯГО ГАВОРЫЦЬ ЦЯПЕР УВЕСЬ СВЕТ. ЧЫМ ЗАСЛУЖЫЎ ЁН СУСВЕТНУЮ ВЯДОМАСЦЬ!..

ПРАЙШЛО больш як два месяцы з таго дня, калі паліцыя афінскіх путчыстаў схапіла вядомага грэчаскага кампазітара Мікіса Тэадаракіса і кінула яго ў турму. Самавольства грэчаскай хунты выклікала гнеў і абурэнне ў розных краінах свету. «Свабоду Мікісу Тэадаракісу і яго таварышам!» — такое аднадушнае патрабаванне сусветнай грамадскасці, якая горача палюбіла яго выдатную музыку, асабліва песні і танцы з кінафільма «Алексіс Зорбас». Танец героя фільма Алексіса Зорбаса, вядомы пад назвай «Сіртакі», стаў сімвалам дружбы і адзінства моладзі розных краін.

Мікіс Тэадаракіс прайшоў цяжкі, але цікавы шлях — ад музыканта-аматара да кампазітара з сусветным імем. Нарадзіўся ён на востраве Хіёсе 29 ліпеня 1925 года. Бацька— выхадзец з вострава Крыт, маці—нараджэнка Малой Азіі. Ад бацькі ён унаследаваў маладзецкую зухаватасць і смеласць характару, а ад маці— глыбокую любоў да музыкі.

Ледзь Мікіс закончыў кансерваторыю, як для яго пачаліся гады высылкі і турэмнага зняволення за ўдзел у Супраціўленні. У ліпені 1947 года яго высылаюць на востраў Ікарыю. Але і тут, на катарзе, Тэадаракіс знаходзіць у сабе сілы зайняцца любімай справай. Ён робіць чарнавыя накіды сімфанічнай паэмы «Маці» і «Трэцяя сюіты». У пачатку 1949 года Тэадаракіса пераводзяць у канцлагер на Востраве смерці — Макронісасе. Там яго па-нечалавечы катавалі, скалечылі фізічна, расстроілі нервовую сістэму. Цудам удалося яму выйсці жывым з гэтага пекла.

З 1950 па 1952 год Тэадаракіс служыць салдатам у арміі. Ён працягвае барацьбу, вядзе палітычную работу як член дэмакратычнай партыі ЭДА. Дзякуючы гэтаму на выбарах 1951 года за ЭДА было пададзена большасць галасоў у батальёне, дзе служыў Мікіс. Пасля дэмабілізацыі Тэадаракіс становіцца пастаянным музычным крытыкам дэмакратычных газет. Адначасова ён працягвае ствараць музыку.

Валодаючы надзвычай яркім талентам і дараваннем мастака-музыканта, Тэадаракіс па-майстэрску адлюстраваў у сваіх творах драматычныя падзеі часоў гітлераўскай акупацыі і грамадзянскай вайны. «Калі я думаю аб мінулым, — пісаў Тэадаракіс у сваёй кнізе «Аб грэчаскай музыцы», — я заўсёды спатыкаюся аб застылыя, ледзяныя твары загінуўшых барацьбітоў, якія глядзяць на мяне сваімі адкрытымі жывымі вачыма. Гэтым забітым маім сябрам я прысвяціў амаль усё тое, што напісаў да гэтага часу».

Гэтай тэме, драматычнаму паказу грамадзянскай вайны, прысвечана Першая сімфонія Тэадаракіса, накіды якой ён зрабіў яшчэ ў канцлагеры на Макронісасе. За Першай сімфоніяй пайшлі санаты, санаціны, харавыя творы, балеты «Грэчаская масленіца» і «Арфей».

У 1953 годзе, ужо сталым музыкантам, Тэадаракіс выязджае ў Парыж і паступае ў кансерваторыю, дзе працягвае вучобу па класу музычнага аналізу ў прафесара Аліўе і па дырыжорскаму класу — у прафесара Эжэна Віго. Займаючыся ў кансерваторыі, Мікіс знаходзіць час для таго, каб ствараць музыку. Ён піша Першую сюіту для фартэпіяна і аркестра, якая потым на Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве была ўдастоена залатога медаля. Забягаючы наперад, адзначым, што ў 1959 годзе Тэадаракіс быў узнагароджаны амерыканскім прызам Коблей, а ў 1963 годзе — медалем Сібеліуса за ўсю сваю сімфанічную творчасць.

К часу заканчэння Парыжскай кансерваторыі Мікіс Тэадаракіс атрымаў сусветнае прызнанне. Многія вядомыя заходнееўрапейскія і амерыканскія тэатры, кінастудыі і філармоніі прапанавалі яму стаць іх супрацоўнікам. Тэадаракіс, аднак, вырашыў вярнуцца да сябе на радзіму, да свайго народа. У Грэцыю ён вярнуўся ў 1959 годзе з цыклам з васьмі песень на вершы з паэмы вядатнага грэчаскага паэта Яніса Рыцаса «Эпітафіі». Паэма прысвечана крывавай расправе паліцыі з мірнай дэманстрацыяй рабочых горада Салонікі ў 1936 годзе. Запісаныя на пласцінкі, гэтыя песні ўмомант разышліся па ўсёй краіне. Іх сталі спяваць простыя рабочыя, служачыя, сяляне, выконваць на канцэртах, у таверн ах, па радыё. Гэта акрыліла Мікіса, і ён вырашыў часова адмовіцца ад стварэння сімфанічнай музыкі, у чым бачыў сваё прызванне і галоўны сэнс свайго жыцця, і цалкам прысвяціў сябе стварэнню папулярных народных песень, якія б дапамаглі яго суайчыннікам жыць і змагацца за шчаслівую будучыню.

Так нарадзіліся цыклы «Палітыя» (горад) № 1 і № 2. «Архіпелаг», «Чырвоны горад», «Дзэрціры», «Эпіфанія» (паверхня), «Песня аб памёршым браце», «Заложнік», цыкл песень «Маўтхаўзен» на вершы з паэмы былога вязня фашысцкага канцлагера Якаваса Камбанеліса «Балада ад Маўтхаўзене» і «Рам'ёсіні» («Грэкі») на вершы аднайменнай паэмы Яніса Рыцаса, у якой паказаны яскравы малюнак барацьбы грэчаскага народа ў гады другой сусветнай вайны. Першае ж публічнае выкананне гэтых цыклаў з'явілася сапраўдным трыумфам Тэадаракіса і вылілася ў палітычную дэманстрацыю.

Сваім прыкладам ён захапіў вялікую групу маладых кампазітараў, такіх, як Ксархакас, Леандзіс, Маркапулас, Лаізас, Маўрудзіс, Савапулас і іншых, якія склалі новую плынь паслядоўнікаў Тэадаракіса. І ў гэтым сэнсе мы можам гаварыць аб з'яўленні музычнай школы Тэадаракіса.

Сваёй патрыятычнай дзейнасцю Мікіс Тэадаракіс здабыў глыбокую любоў і прызнанне грэчаскага народа, асабліва моладзі. Невыпадкова таму, калі ў 1963 годзе пасля зверскай расправы з палымяным барацьбітом за мір Грыгорысам Ламбракісам узнік рух маладых ламбракідаў, якія пакляліся працягваць справу Ламбракіса, на чале гэтага руху стаў Мікіс Тэадаракіс. Ён быў выбраны старшынёй арганізацыі «Дэмакратычная моладзь Ламбракіса», якая пад яго кіраўніцтвам вырасла ў самую шматлікую і ўплывовую маладзёжную арганізацыю ў Грэцыі, якая ішла ў першых радах барацьбітоў за дэмакратычныя перамены.

У лютым 1964 года Тэадаракіса выбралі дэпутатам парламента ад адной з выбарчых акруг Піраяя. На гэтай пасадзе ён дастойна абараняў інтарэсы працоўных.

У цяжкія паслякрасавіцкія дні ваенна-фашысцкай дыктатуры Тэадаракіс зноў са сваім народам. Ён ідзе ў падполле і ў радах Патрыятычнага фронту мужна працягвае барацьбу супраць тыраніі. Яго палымяныя звароты з падполля да грэчаскай і сусветнай грамадскасці знаходзілі гарачы водгук як у самой Грэцыі, так і за яе рубяжамі. «Я лічу, — пісаў ён у адным з такіх зваротаў, — што мой абавязак, як і кожнага грэка-патрыёта, цалкам падзяляць усе выпрабаванні грэчаскага народа і аддаць усе сілы абароне гонару і свабоды нашага народа. У імя гэтага я вяду барацьбу ў радах Патрыятычнага фронту. Я бязмежна веру ў непераадольныя сілы нашага народа і ў непахісную грэчаскую моладзь... Я ведаю, барацьба будзе цяжкая, але наперадзе нас чакае перамога справядлівасці, праўды, дэмакратыі...»

У цяжкіх умовах падполля Тэадаракіс працягваў тварыць музыку і знаходзіў шляхі перапраўляць свае новыя песні за граніцу. Адна з іх — «Песня свабоды» — атрымала спецыяльны прыз Сочынскага фестывалю песні. Самая апошняя песня Тэадаракіса — «Ніколі», прысвечаная ўсім змагарам супраць фашысцкай дыктатуры, напісана ім ужо ў турме.

Мяркуючы па апошніх паведамленнях, над Тэадаракісам рыхтуюць судовую расправу. Здзекі ваеннай хунты з выдатнага прадстаўніка грэчаскай культуры, палымянага барацьбіта за мір, выклікае абурэнне і трывогу сусветнай грамадскасці. Выказваючы заклапочанасць і трывогу савецкіх людзей, у сувязі з паведамленнямі аб небяспецы, якая пагражала жыццю Мікіса Тэадаракіса. Савецкі ўрад зрабіў заяву ўраду Грэцыі, у якой папярэджваў, што «расправа над Мікісам Тэадаракісам і любая акцыя, якая ставіць пад пагрозу яго жыццё, былі б сустрэты з абурэннем савецкім народам».

С. КАЛМЫКОЎ,
(ТАСС).

На той бок

ГУЧЫЦЬ, ЯК АБВІНАВАЧАННЕ

Патанаючыя ў зеляніне вілы амерыканцаў і сайгонскіх чыноўнікаў, абгароджаныя мяшкамі з пяском, калючым дротам і бетоннымі сценамі шматпавярховыя гасцініцы і мора гаротных хацінак, якія патанаюць у гразі, тысячы і тысячы в'етнамцаў, якія не маюць работы і кавалка хлеба,— такім прадстаў Сайгон перад англійскімі тэлегледачамі ў паказаным тут фільме «Сайгон». Фільм зняты амерыканскай кампаніяй Сі-Бі-Эс.

Самаздаволены твар «маршала» Кі, які праносіцца на «кадзілаку», акружаны эскортам узброеных да зубоў матацыклістаў, і галодныя, пакалечаныя вайною дзеці. Хапаючы праходжага здаровай рукой за падол, шасці-сямігадовы хлопчык працягвае да яго другую руку, без нісці. Ён падносіць кульцу да рта, ён хоча есці.

«Бальніца» ў Сайгоне, дзе няма водаправода і каналізацыі, дзе дарослыя і дзеці ляжаць у калідорах на падлозе. Буйным планам— твар дзіцяці, абвуглены напалмам. Другі кадр — у калясцы вязуць дзяўчынку без абедзвюх ног.

І сярод усяго гэтага жаху, што абрушыўся на людзей—тыя, што прынеслі смерць, калецтвы, невыказныя пакуты мільёнам людзей у Паўднёвым В'етнаме. Рассоўваючы натоўп на вуліцах, ідуць сытыя, мардатыя хлопцы. Яны ідуць групамі і па адным, едуць на матацыклах і на ваенных аўтамашынах. Яны весяляцца ў барах, абдымаючы прадажных прыгажунь і глытаючы віскі. Абвешаныя зброяй, стаяць яны на рагах вуліцы, насунуўшы на бровы сталёвыя каскі, не спускаючы насцярожаных вачэй з праходжых.

«Вялікасвецкі раут» у саноўніка сайгонскага «ўрада». У гасцінай пацягваюць спіртныя і прахладжальныя напіткі генералы і «цілія амерыканцы» ў цывільным. Суровыя твары прафесіяльных ваенных, цвёрдыя падбародкі, старанна расчасаныя праборы, адпрасаваныя мундзіры і смокінгі. Так, гэтыя людзі поўныя рашучасці і далей выконваць загады: забіваць, знішчаць, адным словам, «абараняць свабоду».

І тут жа кадр: амерыканец у цывільным падкідвае на руках в'етнамскае дзіця. Ах, ён так любіць дзяцей, ён так любіць в'етнамцаў. Маці дзіцяці глядзіць на прыхадня поўнымі нянавісці вачыма.

Яны чужыя ў В'етнаме, яны не разумеюць в'етнамцаў, прызнае дыктар.

Ноччу па вуліцах Сайгона ходзяць толькі патрулі. У чорнай цемры пранізліва ўспыхваюць фары ваенных аўтамашын, цяжка грукочуць танкі. Няспынна чуюцца выбухі і стрэлы. Гэта вядуць бой з акупантамі в'етнамскія патрыёты. Ноччу амерыканцам у Сайгоне асабліва няўтульна, адзначае дыктар.

Аўтары фільма абвінавачваюць за становішча ў Сайгоне і ва ўсім Паўднёвым В'етнаме каго хочаш: былых французскіх каланізатараў і саміх в'етнамцаў, у першую чаргу В'етконг, як яны называюць барацьбітоў за вызваленне Паўднёвага В'етнама.

Аднак хацелі гэтага аўтары фільма ці не, ён гучыць, як абвінавачанне ў адрас Злучаных Штатаў Амерыкі, тых, хто паслаў на в'етнамскую зямлю паўмільённую армію акупантаў, якая сее смерць і разбурэнні ў гэтай далёкай ад ЗША краіне.

Мікалай ТУРКАЦЕНКА,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

ЧЫРВОНЫЯ КАМЕНЬЧЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

— Па кім будзеш страляць?

— Вось, — паказвае вінтоўкай Яшка. — Пасля па тым, і яшчэ вунь па тым...

— Гэта гаўптштурмфюрэр СС Курт Эрдмансдорф, — кажа загадчык. — Начальнік групы 308. У кастрычніку сорак трэцяга года кіраваў карнай экспедыцыяй каля Старых Брадоў. Горш за звера. Зразумеў?

— Так.

Яшка кладзе вінтоўку на бар'ер і доўга цэліцца ў «Курта Эрдмансдорфа». Цяжкую мішэнь ён выбраў сабе: «Гаўптштурмфюрэр СС» прымацаваны ў самым далёкім кутку, і страляць трэба па дыяганалі, праз вузкую шчыліну.

— Дадайце яшчэ трохі патронаў,—просіць Яшка.

— А можа ў шашкі згуляем? — са спагадаю ў голасе кажа дзядзя Валянцін: ён бачыць, як нязручна хлопцу адной ды яшчэ левай рукой страляць.

— Не, я хачу збіць яго...—упарта часціць Яшка.

Загадчык ціра высыпае з карабка на бар'ер некалькі парожніх куль. І Яшка пачынае страляць. Ён не заўважае нічога наўкол. Толькі брэх аўчарак, грукат танкаў, фантаны балотнай гразі ад выбухаў... Ды маці, якая ўпала... А побач баравікі, аблітыя крывёй... Усё гэта бачыць і чуе Яшка цяпер, як наяве. Ён моцна, ажно да болю сціскае зубы і не перастае страляць.

— Дайце патроны, — крычыць праз нейкі час Яшка.

Цір тым часам патрохі напаўняецца людзьмі. У ціры толькі тры новыя вінтоўкі, і за спіной Яшкі ўжо чуюцца нездаволеныя галасы. Тады Яшка выпускае з рукі вінтоўку і паварочваецца да людзей...

— Ты што гэта, хлопец? — бянтэжыцца раптам уражаны знявечаным тварам чалавек у міліцэйскай форме, які першы хацеў узяць пасля Яшкі вінтоўку.

І ўсе пачынаюць глядзець у той бок, куды страляў Яшка: там у зялёным квадраце пагойдваецца постаць мардастага эсэсаўца.

— Курт Эрдмансдорф, — кажа дзядзя Валянцін. — У сорак трэцім годзе, каля Дрыбіна...

Чалавек у міліцэйскай форме хутка бярэ вінтоўку з бар'ера, пачынае цэліцца.

— Дзядзя, — просіць Яшка, як скрозь слёзы. — Дайце мне, я яго сам... на яго міне мая мама...

— Бяры!

— Цэнтроўка, — напамінае дзядзя Валянцін. — Толькі спакойна, сынок.

Яшка кладзе ў ствол маленькую кулю, ляскае затворам. У ціры на нейкі момант настае чуйная цішыня. Нарэшце гучыць стрэл і мардасты эсэсавец куляецца ўніз.

— Малайчына, хлопец, — чуюцца за спіной галасы.

Яшка моўчкі аддае вінтоўку і выходзіць з ціра. Супакоены, ён ідзе дамоў.

Жыве Яшка ў свайго дзеда, сталяра Камандышкі. Дзед на сваім вяку шмат набудаваў чаго. Будаваў ён і мост, што вісіць цяпер над Дняпром.

— А мяне ў музей сёння звалі, — кажа ўнуку дзед Камандышка. — Просяць — гавары, дзе ваяваў...

Твар у дзеда маленькі, з навіслымі белымі бровамі. Яго цёмныя круглыя вочы неспакойныя. Але Яшка ведае, што дзед ужо амаль не бачыць — слепне. І ніхто не здагадваецца пра гэта, бо дзед па-ранейшаму сячэ дровы, даглядае сваю няхітрую гаспадарку.

— Грошы я атрымаў, — кажа Яшка.— Вось, вазьмі...

— Што грошы!.. — уздыхае дзед.

— А мне чамусьці цяпер веласіпеды сняцца, — нечакана нават для самога сябе гаворыць дзеду Яшка. — Няхай бы лодкі, а то веласіпеды...

Стомлены, Яшка падыходзіць да тапчана, на якім спіць, пачынае ладзіцца на ноч.

«Трэба прачнуцца заўтра як раней, — думае ён. — Дзяўчынка ж прасіла чырвоных каменьчыкаў. Трэба абавязкова назбіраць».

Пераклад з рускай мовы.

СЛЯДЫ ДАЛЁКАГА ПРОДКА

Незвычайная знаходка, якая мае сусветнае навуковае значэнне, выяўлена ў раёне паўночнавенгерскага горада Рудабаня. Галоўны геолаг шахты Габар Хэрняк перадаў вучоным знойдзеную ім сківіцу старажытнай істоты, якіх да гэтага часу ва Умераным поясе яшчэ не знаходзілі.

Навуковы работнік Міклаш Крэцаі расказаў карэспандэнту агенцтва МТІ аб знаходцы наступнае: гэтая сківіца належыць істоце, якая жыла шэсць-дзесяць мільёнаў гадоў назад, якая ўжо не была малпаю, але яшчэ і не стала чалавекам, а толькі пачала сваё развіццё да яго. То быў перыяд, калі выявіліся дзве галіны развіцця: адна вяла да цяперашніх чалавекападобных малпаў, другая—да чалавека. Чатыры зубы, якія захаваліся на сківіцы, сведчаць аб тым, што гэта істота знаходзілася ў перыяд пераходу да ўсяднага ладу жыцця ў адрозненне ад малпаў, якія харчаваліся толькі расліннай ежай. Гэта старажытная істота была на самай нізкай ступені развіцця, якая ішла непасрэдна за выяўленнем дзвюх розных галін.

Анатоль СЯМЁНАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Будапешт.

Наступны нумар газеты «Літаратура і мастацтва» выйдзе 17 лістапада г. г.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва—6-25-19, бух-галтэрыі—6-25-87.

«Литература и искусство», орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 24064